№№138–139
(2449–2450)

1 верасня 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

СТОП-ФАКТ

Спыніцеся, русіфікатары!

І ўсё ж многія нашы чыноўнікі не хочуць беларусамі звацца. Яны аж са скуры вылузваюцца, імкнучыся русіфікаваць усё, што можна русіфікаваць. Хто з мінчан не звяртаў увагу на надпіс над галоўным уваходам у адміністрацыю Кастрычніцкага раёна. Хоць бы прадубліравалі па-беларуску. Куды там! Няма ў нас ні беларускага алфавіта, ні беларускай мовы. Ёсць толькі *русский язык*. І гэта ўлада?! Так і хочацца спытацца: чыя яна? Маскоўская? Расійская?

Літаральна ў нейкай сотні метраў адзін з адміністрацыйных будынкаў Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. Зноў жа: на ўсю шырыню цэнтральнага ўваходу — рускамоўная шыльда. Герб беларускі, а ўсё астатняе — на мове суседняй краіны. І мы хочам, каб нехта нас паважаў, лічыў беларусамі?

Ды што і казаць, вытручваюць з нас наша, беларускае, на кожным кроку. Вытручваюць у садках і школах, каледжах і інстытутах... Зірніце на шыльду аднаго з карпусоў навучальнай установы: *"Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники"*. Прабачце, які ён беларускі, які ён дзяржаўны, калі ўжо сустракае абітурыентаў на мове чужой краіны? Вы можаце ўявіць, каб у суседняй Польшчы нацыянальная ўстанова мела шыльду на нямецкай мове?

Як тут не ўсклікнуць: "Спыніцеся, русіфікатары!" Беларусь вас корміць і поіць, а вы так няўдзячны да яе. Мова — гэта ж душа народа, а вы топчацеся па ёй...

КАДРЫ

Змена каравула

Аляксандр Лукашэнка прызначыў **Алега Краўцова** дырэктарам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, вызваліўшы ад гэтай пасады Юлія Кашынскага.

Ю.Кашынскі ўзначальваў НЦПІ з моманту яго стварэння ў 1997 годзе. Што ж тычыцца Алега Краўцова, то ён раней працаваў намеснікам міністра юстыцыі.

ПЕРАМОВЫ

А ці не купіць нам радовішча?

Беларусь вядзе перамовы аб удзеле ў здабычы газу і нафты на тэрыторыі Расіі, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік старшыні канцэрна "Белнафтахім" **Міхаіл Асіпенка**.

Паводле яго слоў, у Маскве заснавана ЗАТ "Беларусьнафтагаз", якое разглядае магчымасць удзелу Беларусі ў асваенні некалькіх радовішчаў на тэрыторыі РФ. "Як мае быць, уладальнікі радовішчаў хочуць атрымаць за гэта пабольш, а мы імкнёмся знізіць цану", — падкрэсліў М.Асіпенка. Ён не назваў месца размяшчэння радовішчаў і імёны іх уладальнікаў, "паколькі дагаворам прадугледжана канфідэнцыяльнасць гэтай інфармацыі".

Марына НОСАВА.

ПОЗДРАВЛЯЕМ!

Лауреаты премии имени Дмитрия Завадского

ОАО "Первый канал" и Белорусская ассоциация журналистов объявили имена лауреатов премии имени Дмитрия Завадского за 2006 год. В этом году премии будут вручены трем журналистам из Беларуси за мужество и профессионализм. Также впервые в награждении победителей примет участие и Фонд имени Завадского, учрежденный его семьей и друзьями.

Лауреатами премии за 2006 год стали фотограф **Юлия Дорошкевич**, главный редактор газеты "Наша ніва" **Андрей Дынько** и корреспондент газеты "Комсомольская правда" в Белоруссии" **Олег Улевич**.

"Премия Дмитрия Завадского была учреждена в память о нашем похищенном друге и коллеге, человеке с безупречной профессиональной и человеческой репутацией. Мы стараемся награждать этой премией самых достойных белорусских журналистов, потому что для нас — это не формальная акция, это дань памяти нашего товарища и боль наших сердец", — заявил журналист Первого канала Павел Шеремет.

Соб.инф.

ДЗІКУНСТВА

Рэпрэсіўная псіхіятрыя?

Актывіста Аб'яднанай грамадзянскай партыі Паўла Язерскага затрымалі 7 ліпеня, у дзень знікнення тэлеаператара Дзмітрыя Завадскага. Хлопец адмовіўся даваць паказанні, і тады яго з міліцэйскага пастарунку накіравалі ў Гродзенскую псіхіятрычную бальніцу.

Юрысты АГП лічаць гэты факт доказам існавання ў краіне рэпрэсіўнай псіхіятрыі і будуць спрабаваць дабіцца ад пракуратуры ўзбуджэння супраць урачоў крымінальнай справы. Павел ужо прайшоў незалежную псіхіятрычную экспертызу ў Расіі, дзе спецыялісты пацвердзілі, што хлопец не мае ніякіх паталогій і ніякае псіхіятрычнае лячэнне яму не патрэбна.

Алена НОВІКАВА.

ПРЕССинг

Деньги со счета ЗАО «БелКП-ПРЕСС» могут перекочевать на счет Александра Шпилевского

На прошлой неделе Минский городской суд признал редакцию газеты "Комсомольская правда" в Белоруссии" виновной и обязал выплатить главе Таможенного комитета Беларуси 60 миллионов рублей. Такова сегодня в нашей стране цена технической ошибки независимой прессы и стоимость чести и достоинства чиновника.

— *Конечно, мы надеялись на лучшее,* — говорит редактор белорусской "Комсомолки" Юлия Слуцкая. — *Но судьи Минского городского суда Жупикова, Кропивка и Соловьева посчитали, видимо, адекватной сумму 60 миллионов рублей за ошибку. Ошибку, за которую мы несколько раз извинились и извиняемся сейчас.*

Эта история, потрясшая всю независимую прессу, случилась в мае. Читатели "Народной воли" наверняка ее помнят. В одном из своих номеров "Комсомольская правда" в Белоруссии" вместо снимка менеджера известного во всем мире футболиста Александра Глеба Николая Шпилевского ошибочно разместила фото главы ГТК Беларуси Александра Шпилевского. Главный таможенник обиделся и обратился с исковым заявлением в суд. *"Ответчик опорочил меня в глазах общественности и отдельных граждан, чем причинил колоссальный моральный вред, выразившийся в нравственных и психологических переживаниях о моей репутации государственного служащего высокого ранга"*, — написал в иске Александр Шпилевский.

Журналисты "Комсомолки", на наш взгляд, искренне удивлялись определению *"колоссальный моральный вред"*, ведь в комментарии агента Глеба ничего скандального не прозвучало. Кроме того, "Комсомольская правда" в Белоруссии" официально извинилась перед Александром Шпилевским лично и на страницах газеты.

Однако суд Советского района Минска удовлетворил иск главного таможенника страны. И решил, что "Комсомолка" вместо заявленных в иске 80 миллионов должна выплатить Александру Шпилевскому 60 миллионов. Журналисты оспаривали решение в Минском городском суде. Как выяснилось теперь, безуспешно.

— *Мы, конечно, готовим надзорную жалобу на имя председателя Минского городского суда,* — говорит главный редактор белорусской "Комсомолки" Юлия Слуцкая. — *Но механизм изымания денег со дня на день будет запущен. Как только решение Городского суда будет направлено в районный, судебный исполнитель сможет начать процедуру снятия денег с наших счетов.*

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Вучоба і стажыроўка ў Чэшскай Рэспубліцы

Чэшскія вышэйшыя навучальныя ўстановы прапануюць ужо ў гэтым годзе студэнтам і іншым зацікаўленым работнікам недзяржаўных арганізацый камандзіроўкі і кароткатэрміновыя стажыроўкі і курсы ў Чэшскай Рэспубліцы. Гэтыя праекты фінансуюцца ўрадам Чэшскай Рэспублікі.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць па тэл.: **+375 29-620-34-87, + 375 29-328-59-92.**

Казалось бы, после "элегантной победы" Лукашенко в стране должна наступить политическая оттепель. Ан нет. Даже рядовые поездки лидеров оппозиции в регионы сопряжены с событиями на грани абсурда.

Редакция попросила лидера Объединенной гражданской партии **Анатолия ЛЕБЕДЬКО** *поделиться впечатлениями о недавнем путешествии в Могилев.*

Невероятные приключения граждан в Могилеве

Анатолий ЛЕБЕДЬКО



Полдень.

Контрастный город Могилев.

"Запорожец" весь в заплатах, со щетиной ржавчины на помятых боках упорно не пропускает глазастый, блестящий "Мерседес" с номерами, указывающими на близость его хозяина к властной вертикали.

В квартале от облисполкома ухоженный джентльмен с депутатским значком на лацкане костюма из бутика и одинокий старик, тщательно исследующий содержимое мусорного бака.

Центральные аллеи, покрытые тротуарной плиткой, и городские окраины, вымощенные ухабинами.

Непрекращающаяся череда контрастов за окном нашего автомобиля. Кстати, наша первая цель — это завод по производству тротуарной плитки. Точнее, нас интересует не предприятие, которым руководит отпрыск известного на Могилевщине чиновника, а Артур Финькович, отбывающий здесь барщину белорусского политзаключенного.

Телефон Артура с самого утра упорствует в молчании. Уговариваем себя, что это случайность. Вот и проходная завода. Наш парламентарий Владимир Шанцев приносит дурные вести. За час до нашего приезда сотрудники силовых структур увезли Артура в неизвестном направлении. Впоследствии нам не удалось найти его и в спецкомендатуре, уже после 20 часов вечера. Согласно журналу регистрации, в это время Финькович еще находился на рабочем объекте.

Что тут сказать? Наверное, в этот день Артуру *"чертовски захотелось поработать"*. А может, белорусские политзаключенные выступили с почином реанимировать стахановское движение? Или же бдительные Сухоренко и Миклашевич таким образом решили предотвратить очередной план по заброске мертвой крысы в очистные сооружения Могилева? Умом наши власти не понять, а политическую шизофрению аршином общим не измерить.

Оставалось разве что оставить автограф в книге жалоб и предложений спецкомендатуры. Но здесь уместно уточнение. Это не претензии к работникам данного учреждения. Формально они не нарушили ведомственные инструкции, к сожалению, ставшие для них конституционным законом. Режиссеры подобных "высокоинтеллектуальных" операций восседают в других кабинетах. Все это, однако, и мелко и мерзко.

14 часов 10 минут. Веселый город Могилев. Конечно, не знаменитые Автюки, но все же. Здесь тоже случаются казусы и парадоксы, вызывающие и смех, и слезы. Особенно любят поразвлечься в местных судах. В ходе прошедшей президентской кампании именно здесь 7 марта стартовала зачистка команды единого кандидата. В этот день за организацию встречи с избирателями Владимир Шанцев получил 15 суток ареста, а автор этих строк — штраф величиной в полтора миллиона рублей.

Воспоминания заставили нас свернуть на Бонч-Бруевича, улицу бракосочетания судов и прокуратуры. Здания этих ведомств, как ласточкины гнезда, прижимаются друг к другу. Чем ближе здание суда Ленинского района, тем больше пупырышек ностальгии на сердце. Грех не навестить судью Юрченко, ведь не виделись с марта. Тем более что есть повод. В портфеле брошюры "Реформа судебной системы". (пособие Национального комитета для тех, кто хочет быть судьей, а не политическим киллером в судебной мантии). Вдруг брошюра, подобно "Колоколу" Герцена, разбудит задремавшую белорусскую Фемиду.

Вот и здание с нужной вывеской. Непрерывное двустороннее движение через оностворчатую дверь. На входе милиционер, безразлично взирающий на ходоков за правдой и справедливостью. Однако впечатление, что он выполняет функцию манекена обманчиво. Как только мы переступили порог и вторглись на территорию фойе, сержантские погоны зашевелились. Такое ощущение, что в голове служивого сработала сигнализация. Он отреагировал на нас, как на фото со стенда "Их разыскивает милиция". Прояснив наши намерения увидеть судью Юрченко, а заодно получить мартовское постановление о привлечении меня к административной ответственности, милиционер ретировался. Мы остались в одиночестве на осиротевшем посту. Как и следовало ожидать, судьи в разгар рабочего дня на рабочем месте не оказалось. Зато минут через десять мне вынесли и торжественно вручили то самое постановление, датированное 7 марта текущего года. Пришлось воспользоваться системой бартера и передать отсутствующему судье "Реформу судебной системы".

В произошедшем есть позитивный штрих. Оказывается, для оппонентов режима в могилевских судах внедрен принцип одного окна. Это так трогательно. Нам там верят на слово. И с презрением относятся к бюрократическим процедурам, типа предъявите паспорт или распишитесь за получение постановления.

Где-то в душе скребла коготками мысль, что судья Юрченко сознательно избегает нашей встречи. Мне суждено теряться в догадках, что это. Эхо убегающей совести? Или инстинкт самосохранения прятающейся улитки? Я представил, что в эти минуты судья Юрченко читает брошюру Национального комитета, и погрузился в чтение постановления суда от 7 марта 2006 года: *"Лебедько А.В 7 марта 2006 в 13.30 часов, являясь доверенным лицом кандидата на выборах в президенты А.Милинкевича, проводил встречу с избирателями Могилева в форме собрания, на котором публично обсуждал вопросы социально-политической обстановки в Беларуси, а также вел агитацию в пользу вышеуказанного кандидата, чем нарушил установленный порядок организации и проведения собраний..". "Лебедько виновен в нарушении установленного порядка организации и проведения собраний, а также встреч кандидатов в президенты и их доверенных лиц с избирателями, установленный Могилевской городской комиссии по выборам президента — протокол №4 от 17 февраля 2006". "Суд постановил: подвергнуть Лебедько штрафу в размере 50 базовых величин, что составляет 1.555.000 рублей".* Воистину от закона до беспредела один шаг!

Половина четвертого. Красивый город Могилев. Кудри зелени бегут по холмам, неподрезанной челкой спадают на широкие плечи уютных улиц. Улица Ленинская — местный Арбат. По пешеходному руслу течет народ, каплями расплескиваясь по магазинчикам и кафешкам. Люди спешат. Вприпрыжку за покупками, вдогонку за ускользающим временем. Ныряем в людское течение с кипами "Народной воли". Оно нас или отторгнет и выбросит на обочину как одноразовую салфетку, либо наполнит энергетикой действий наши паруса. Справа и слева протянутые руки. Газета расходится, как горячие пирожки, когда зубы от холода выстукивают азбуку Морзе. Или как эскимо, когда во рту пустыня Сахара. Периодически возникают микродиалоги. "Ого, "Народная воля" (!?) А можно еще парочку экземпляров?! Скажите, где можно купить газету? Отказников — единицы. Может, потому, что дармовщина, а может, потому что в стране информационный голодомор.

Хорошее, однако, всегда имеет свои географические границы. Минут через двадцать натыкаемся на непреодолимую мель. Люди в форме. Сержантско-старшинский наряд предлагает мне и Игорю Шинкарику пройти в ближайший пункт охраны правопорядка. На пять минут. Предложение, от которого невозможно отказаться. Протянутые руки справа и слева. Чем ближе место назначения, тем меньше улик, то бишь газет в наших руках. В здании милиции ниточка фразы "и доколе приказ будет сильнее закона" сплетается в клубок беседы. Следствием которой становится коллективное чтение "Народной воли" сотрудниками милиции. А почитать есть что, перипетии судебного процесса по делу активистов из "Партнерства", материалы по Козулину, по экономической ситуации.

Параллельно с разговором, окрашенным в политические тона, работает процедура. Наши данные тщательно переписывают. На всякий случай. А учитывая, что случай бывает разный, делают это несколько раз. На поверхности дело выглядит плевым. "Народная воля", изрядно потрепанная в штормах и бурях репрессий, имеет свой законный паспорт, а значит, и право на легальное существование. Но там, начиная с первой и до последней строчки, все такое непривычное, контрастное.

Каждый наш собеседник не преминул отметить, что это маленькое недоразумение, которое разрешится одним телефонным звонком наверх. Решить вопрос быстро как-то не получалось. Наверное, мешали фамилии задержанных. Каждый предпочитал подстраховаться решением вышесидящего на жердочке. Пятиминутка неприлично растягивается до часа. И вот наконец долгожданное: "Извините". Уходим.

Не успели отойти на пятьдесят метров от опорного пункта, как сзади зацокали каблуки наряда милиции. Смущенные стражи порядка просят вернуться обратно. Дескать, там наверху возникли новые обстоятельства. Снова длительные телефонные консультации. И вот вторично перед нами загорается зеленый свет.

На этот раз удалось преодолеть метров 70. И снова вдогонку цок, цок. На лице лейтенанта неприкрытые досада и растерянность.

Решение бродит где-то в районе кабинета полковника Оленушкина, зам. начальника УВД Могилевщины или его телефонного аппарата. Наконец, проблему разрешило подкрепление, прибывшее в форме майора Устинова. Расстались по-домашнему, с пониманием в глазах.

Мы вновь на могилевском Арбате. Слева и справа протянутые руки. И возгласы: "Пожалуйста, еще один экземпляр". Для мамы. Для соседа. Для коллеги. Параллельным курсом мирно движется улыбающийся сержантско-старшинский наряд.

Народная Воля
1 ВЕРАСНЯ 2006 г.

ГОСТЬ «НАРОДНОЙ ВОЛИ»

Посланник страны Муаммара Кадаффи в Беларуси знает четыре иностранных языка, интересуется белорусским и обучает своих детей в лучших мировых университетах

*Накануне национального праздника — Дня революции — Чрезвычайный и Полномочный посол Великой Социалистической Народной Ливийской Арабской Джамахирии в Республике Беларусь **Абдулла АЛЬМАГРАВИ** дал интервью «Народной воле»*

— Господин посол, в Минске недавно появилось новое большое и красивое здание вашего посольства. Это свидетельствует о том, что наше сотрудничество укрепляется?

— На днях исполнилось 10 лет установления дипломатических отношений Ливии с Беларусью. Можно подвести некоторые итоги, правда, они довольно скромные. Несмотря на то, что создана неплохая договорно-правовая база, достигнутые успехи не пропорциональны существующим возможностям наших стран.

— Что Вы подразумеваете под этим?

— Недавнее снятие международных экономических санкций с Ливии благотворно повлияло на развитие различных контактов и с Беларусью, но есть ряд препятствий, среди которых — малый опыт белорусских предприятий в работе с ливийским рынком и отсутствие морских выходов в Республике Беларусь.

— Известно, Ливия интенсивно разрабатывает нефтедобывающую отрасль. Возможно ли участие белорусов в этих и других совместных проектах?

— Идет обмен кадрами в нефтяной сфере, белорусские инженеры работают в Ливии по индивидуальным контрактам, некоторые специалисты — в системе здравоохранения. Совместные инвестиционные проекты пока немногочисленные, наиболее важные из них: совместный банк ("Трастбанк"), совместная энергетическая компания и компания в области инженерной промышленности, все они работают на территории обеих республик. Успешно работает в Минске и Ливийский арабский банк.

— На недавней международной выставке в Триполи к белорусским товарам, в частности, к мебели, не было проявлено интереса. Почему?

— Мы предлагали белорусской стороне организовать специальную выставку своих различных товаров. Конечно, такой проект нуждается в большом финансировании, но это лучший путь продвижения национальных товаров.

— После того как лидер революции Ливии полковник Муаммар Кадаффи в 2002 году объявил о строительстве в стране "народного капитализма", приватизацию основных средств капитала и начала свободной торговли, какие изменения уже произошли в экономике?

— После трех десятилетий управляемой экономики сегодня идет пересмотр ее жизнедеятельности и выбор наилучших методов развития.

К слову, это североафриканское государство, большая часть территории которого пустыня, с 1961 года занялось эксплуатацией нефтяных ресурсов и некогда полунищая страна вскоре превратилась в процветающую с самым высоким в Африке доходом на душу населения.

— Успешная экономика дала толчок туристическому бизнесу. Что в этом отношении интересно в Ливии для белорусов?

— Мы новички в этом деле, у нас пока он слабо развит, в основном это частный бизнес. Но у нас есть большой потенциал, мы имеем древние города, построенные греками, римлянами в III веке до н. э., в пустыне Сахара есть много изумительных уголков, оазисов, начал развиваться туризм "сафари" на джипах и верблюдах, а на побережье Средиземного моря есть места с золотым песком и "запахом нетронутого чистого моря". Все это экзотика. Ливия по утверждению иностранцев, самая дешевая страна в мире и здесь есть много товаров. Спешу сообщить, что Ливия решила в скором будущем открыть воздушное сообщение между Триполи и Минском, осуществлять рейсы будут самолеты "Белавиа" или частные Ливийские авиалинии. Уже есть проект соглашения между нашими странами, сначала это будут чартерные рейсы, а затем регулярные.

— Около шести лет назад Александр Лукашенко с визитом посетил Ливию. Собирается ли Муаммар Кадаффи с ответным визитом приехать в Беларусь?

— Приглашение получено, оно может осуществиться, как только будут созданы условия для успешного визита.

— По утверждению очевидцев, во время революции дворец Кадаффи напоминал крепость, у входа стояли танки, орудия, сверху в стене пушки. Как сегодня выглядит жилье лидера революции?

— Очень скромно. На территории дворца сохранилась палатка, в которой Кадаффи

принимает с визитом иностранных лидеров.

— Идеологию Ливии в 70-х годах Кадаффи изложил в своей программе "Третья мировая теория", опубликованной им в Зеленой книге. Действует ли она сейчас?

— По истокам ее сейчас реализуется народно-социалистическая культура, у нас в управлении государством действует прямая народная демократия через народные конгрессы и комитеты. Наша страна избрала свой путь развития.

— Интерес к белорусскому языку — у вас семейная традиция, супруга госпожа Зейнаб учит его в Клубе жен дипломатов, Вы — самостоятельно, а дети познают в школе. Чем интересуются Ваши пятеро детей?

— Старшая дочь работает в Триполи, готовится ехать в Лондон продолжать обучение по специальности экономист. Четверо сыновей с нами в Минске, старший заканчивает учебу в Минском медицинском университете и уедет стажироваться в университет Канады, второй сын заканчивает отделение международных отношений в БГУ, возможно, также будет продолжать образование, еще один сын поступает в БНТУ, а младший — школьник-старшеклассник.

— Как Вы оцениваете белорусское образование?

— Неплохое, знания здесь можно получить достаточные для дальнейшей карьеры. В Ливии ценят его, и здесь есть наши студенты.

РЭКОРД

Хлябі нябесныя

Нават па няпоўных даных за жнівень у Беларусі ў сярэднім выпала 134 мм ападкаў, што прыкладна складае 175% месячнай нормы. Пра гэта паведаміла начальнік аддзела метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Валянціна Скрабец. Паводле яе слоў, такі дажджлівы жнівень у Беларусі назіраецца ўпершыню за ўвесь пасляваенны перыяд. Да гэтага самымі дажджлівымі лічыліся жнівень 1956-га і жнівень 1986 гадоў, калі сярэднемесячная колькасць ападкаў у рэспубліцы склала 123 мм.

Паводле інфармацыі В.Скрабец, найбольшая колькасць ападкаў выпала ў Брэсцкай вобласці, дзе моцныя дажджы часта ішлі ў першай палове месяца, і Віцебскай вобласці — за апошнія тры дні. У цэлым у гэтых абласцях у сярэднім выпала 170 мм ападкаў, што ўжо больш чым удвая перавышае месячную норму.

Найменш увільготненымі лічацца Гомельская і поўдзень Магілёўскай вобласці, дзе колькасць ападкаў толькі нязначна перавышае норму. У Мінскай вобласці ў сярэднім выпала 1,5 месячнай нормы ападкаў.

У Віцебску за апошнія 24 дні выпала столькі ападкаў, колькі не выпадала за жнівень на працягу ўсяго шматгадовага перыяду назірання — 256 мм; раней абсалютны месячны максімум ападкаў (232 мм) быў зафіксаваны тут у жніўні 1961 года. Перавышаны таксама абсалютныя месячныя максімумы па ападках у Ашмянах (260 мм), Брэсце (226 мм), Пінску (220 мм), Лепелі (214 мм), Высокім (191 мм). У сталіцы выпала 188 мм ападкаў пры норме для жніўня 81 мм.

Ірына САЗАНОВІЧ.

РЭТРАСПЕКТЫВА

Кароткі трыумф незалежнікаў,

або Ці магла Беларусь пазбегнуць палітычнага адкату?

Аляксандр КЛАСКОЎСКІ,
спецыяльна для «Народнай волі»

15 гадоў таму, пасля паразы путчу, многім з беларускіх нацыянал-дэмакратаў здавалася, што іх перамога — канчатковая і незваротная. Але той рамантызм неўзабаве наляцеў на рыфы.

Чаму ж такім кароткім стаўся трыумф незалежнікаў? Ці непазбежны быў палітычны адкат пад лозунгамі рэстаўрацыі "светлай мінуўшчыны"?

Што і казаць, напрыканцы жніўня 1991 года адбываліся рэчы, проста фантастычныя для Беларусі, якую — праз асаблівую рэакцыйнасць тутэйшай наменклатуры — называлі "Вандэяй перабудовы". Калі путч ляснуўся, Зянон Пазьняк з купкай аднадумцаў паставіў Вярхоўны Савет на вушы. Самлелыя ад страху рэтраграды, як пад гіпнозам, прагаласавалі за канстытуцыйны статус Дэкларацыі аб суверэнітэце і за бел-чырвона-белы сцяг.

Апазіцыя БНФ паказала тады хрэстаматыйны ўзор палітычнага майстэрства, скарыстаўшы гістарычны момант на 120%. Чаму ж наступныя 15 гадоў сталі для дэмакратычных сіл амаль што суцэльнай паласой паразаў?

Згадайма 1994-ты. Тады на першых прэзідэнцкіх выбарах Пазьняк і Шушкевіч спаборнічалі між сабою — і расцерушылі галасы нацыянальна свядомага электарату. Асобныя ж будучыя апазіцыянеры ўвогуле былі ў камандзе Аляксандра Лукашэнкі, якога называлі між сабой "тэрмінатарам". Маючы на ўвазе, што той сыдзе ў палітычны нябыт, пасля таго як выканае пэўную місію — расчысціць шлях да вяршыняў улады ім, адукаваным і хітрым. Але сталася іначай. Між тым — хто ведае, ці здолеў бы імкліва раскруціцца прадстаўнік шклоўскай глыбінкі без спрыяння "маладых прагматыкаў"?

Так ці іначай, але ён з купкай паплечнікаў, маючы сціплыя рэсурсы, перайграў тады ўладную каманду. І, варта прызнаць, гэта таксама ўрок для тых апазіцыйных мэтраў, што паўтара дзесятка год займаюцца глыбакадумнымі тлумачэннямі, чаму ім не пашанцавала.

Зрэшты, выбары-94 кропку не паставілі. Не адразу пачалася гульня ў адны вароты. Гэта цяпер у кіраўніка дзяржавы амаль што неабмежаваныя паўнамоцтвы. А быў жа перыяд, калі кожная галіна ўлады мела сур'ёзную вагу (у тым ліку і Канстытуцыйны суд, які — зараз немагчыма паверыць! — прызнаў шэраг прэзідэнцкіх указаў не адпаведнымі Асноўнаму закону).

Але Вярхоўны Савет не здолеў абараніць свой гонар, калі напрыканцы 1994 года газеты выйшлі з белымі плямамі замест гучнага даклада дэпутата Сяргея Антончыка. Праз некалькі месяцаў парламент праглынуў яшчэ адну пілюлю, калі людзі ў масках збілі і выкінулі з Авальнай залы дэпутатаў-галадоўшчыкаў. Нарэшце, на піку барацьбы супраць наступу аўтарытарызму, у лістападзе 1996-га, частка парламентарыяў, што падпісалі паперу пра імпічмент, раптоўна "ацвярэзіліся" ды перакінуліся ў процілеглы лагер... А іншыя паслухаліся прыляцелых тушыць пажар маскоўскіх дарадцаў на чале з Чарнамырдзіным.

Між тым на плошчы некалькі дзён стаяў народ, гатовы абараняць дэмакратыю (тады яшчэ спецназ так за жабры не браў). Аднак вырашылі абысціся без народа, улагодзіць сітуацыю келейна.

Пакрысе тыя дзеячы, што трымаліся прынцыпу "і нашым і вашым" (на чале з небезвядомым Сямёнам Шарэцкім), будуць выціснутыя з сістэмнай палітыкі ў маргінальную апазіцыю і стануць кусаць локці: эх, каб мы тады трохі смялей!..

Ды і ранейшая апазіцыйная эліта спакваля страціць і ўплыў на масы, і майстэрства вулічнай барацьбы. Цяпер не верыцца, што выводзілі на акцыі ў Мінску па 30—40 тысяч (значна болей, чым было на плошчы 19 сакавіка сёлета!) — і не здолелі скарыстацца гэтым патэнцыялам, расцерушылі ініцыятыву і людскі рэсурс.

Вядома, можна ківаць на тое, што процілеглы бок замест таго, каб цырымонна гуляць у палітычныя шахматы, біў дошкай па галаве.

Можна ўздыхаць, што масам не хапіла свядомасці, што абывацель праглынуў прынаду таннага папулізму, не натхніўшыся высакалобымі апазіцыйнымі праграмамі.

Можна бясконца цешыцца канспіралогіяй, выкрываць руку спецслужб ды бэсціць "марыянеткавую" апазіцыю, што псуе ўсю маліну.

Можна тлумачыць сённяшнюю палітычную апатыю, з аднаго боку, запалохваннем ды рэпрэсіямі, а з іншага — пэўным ростам дабрабыту на танным газе ды нафтавай рэнце.

Дык што, цяперашні варыянт палітычнай сістэмы ў Беларусі быў непазбежны, запраграмаваны?

З такім фаталізмам цяжка пагадзіцца. Шанцы перавесці гістарычную стрэлку пэўна ж меліся. Але ў вырашальныя моманты (палітолагі называюць іх пунктамі біфуркацыі) апаненты рэжыму, скажам так, не бліснулі. Хаця варта адзначыць і прыклады самаахвярнасці — згадайма хаця б спіс тых, каго міжнародныя праваабаронцы называюць вязнямі сумлення.

Канешне, супраць дэмакратаў заўжды дзейнічалі брутальна. Але хіба не ставіла палітычная апазіцыя раз-пораз падножкі сама сабе? Хіба не маюць рацыі тыя, хто крытыкуе яе за хранічныя міжусобіцы, інертнасць, слабае валоданне паліттэхналогіямі, брак крэатыву ды стратэгічнага мыслення? За тыя праявы нерашучасці і бездапаможнасці, калі народ выходзіў на вуліцы насуперак спецназаўскім дручкам, а лідэры, здаецца, не ведалі, што з гэтым занадта рэвалюцыйным народам рабіць...

Гаворка не пра тое, што зараз трэба дружна пасыпаць галовы попелам. Гісторыя не церпіць умоўнага ладу. Але варта спасцігаць яе ўрокі.

У прыватнасці, менавіта жнівень 1991-га паказаў, што можна перамагаць не колькасцю, а ўменнем. Што палітыкі мусяць заўжды быць у баявой гатоўнасці і, калі трэба, ісці вабанк, каб напоўніцу скарыстаць гістарычны шанец.

Цяперашняя сістэма ўлады, хоць і выглядае непарушна, бы магутны сталінскі ампір на былым праспекце Скарыны, зусім не гарантаваная ад крызісу (прынамсі, нафтагазавыя гешэфты неўзабаве могуць стаць толькі ўспамінам). Але якія сілы будуць весці рэй у крытычны момант? Ці давядуць заслужаныя змагары з рэжымам, што ёсць яшчэ парах у парахаўніцах? Ці здолее заявіць пра сябе маладзейшая генерацыя незалежнікаў? А мо, Беларусі наканавана памяняць шыла на мыла?

Ёсць хвіліны, якія вызначаюць хаду гісторыі на дзесяцігоддзі.

Каб Ельцын не ўзняўся тады на танк з заклікам зваліць хунту — хто ведае, ці абрынуўся б ГКЧП, які ўжо навадніў Маскву вайсковымі калонамі?

Каб не пасіянарны Зянон Пазьняк і ягоныя паплечнікі — хто ведае, ці лунаў бы над Домам урада амаль што чатыры гады наш гістарычны сцяг?

Дарма што потым сцяг *"зрэферэндзілі"* — той час пакінуў свой адбітак у свядомасці мноства суайчыннікаў. Так што ідэя вольнай, дэмакратычнай, еўрапейскай Беларусі — жыве і чакае свайго моманту.

ЖИТЕЙСКИМ ВЗГЛЯДОМ

Самолюбие как порок

Юрий ХОДЫКО,
профессор



Гипертрофированное самолюбие присуще многим государственным лидерам. Но немногие неспособны его скрыть. В первую очередь это относится к тем, о ком поговорка гласит: "из грязи — в князи". Яркий пример тому первый и неизменный белорусский президент. Недавно он сам после *"ошеломительной победы"* занервничал и разрешил заменить развешенные во всех госучреждениях портреты себя любимого скромными фотографиями. Действительно, такого чинопочитания не было ни в царские, ни в советские времена. Даже в брежневскую эпоху можно было вместо изображения увешанного медалями генсека повесить портрет В.И.Ленина. Это считалось хорошим тоном. Проявлением верности коммунистическим идеалам.

Но портретомания не единственная слабость ПП РБ. Ему следовало бы перестать играть в хоккей в фуфайке под номером один. В командных играх этот номер традиционно принадлежит вратарю, а Александр Григорьевич любит играть в нападении. Этот номер на спине полевого игрока также нелеп, как и победы грузноватого пожилого мужчины над профессионалами в лыжных и лыжероллерных гонках.

Можно вспомнить и комедийность появления на парадах гражданского человека, облаченного в опереточную форму генералиссимуса. Но находиться вне рамок закона и традиций стало для главного белорусского начальника привычкой и нормой. С каким трудом, сквозь зубы, признал он на так называемом Третьем всебелорусском народном собрании, что он *"не идеальный человек"*. Это после убийственной критики его аморального поведения А.В.Козулиным. Критики, после которой даже в России чиновники уходят в отставку. Вспомним генпрокурора Скуратова.

Возможно, что недельное отсутствие на телеэкранах было вызвано чувствительной раной, нанесенной себялюбию А.Г. в процессе последней избирательной кампании. Оказалось, что он, который "чуть выше Бога", не так любим, как он того заслуживает. Что люди видят его слабости и пороки, а многие требуют покинуть должность, без которой он уже *"не представляет себя"*. Горькое разочарование.

Но возможно, что выиграв, в чем он себя убеждает, очередную кампанию, он впервые ясно увидел размер и сложность тех проблем, которые стоят перед Беларусью. И растерялся. Хотелось бы думать, что это так. Что он увидел бесперспективность того пути, который он самоуверенно начертал перед страной. Что осознал ту степень опасности для ее суверенитета, которые несут игры в союзное государство с Россией, не оставившей имперских мечтаний. Осознал наконец, что изоляция страны, бессмысленная вражда с Западом может в решающий момент дорого стоить ему и Беларуси, над которой в очередной раз нависла угроза аншлюса.

Если это так, то даже такой самолюбивый и самоуверенный человек, как ПП РБ, может впасть в депрессию. Неизбежное падение рентабельности нереформированной промышленности в случае резкого подъема цен на энергоносители. Сокращение экспорта в Россию МАЗов, БелАЗов и "Беларусов". Невозможность опереться на сельскохозяйственный сектор, который без государственных дотаций тут же впадет в глубокую кому. И голодные люди на улицах, которые не поймут любимого президента, как не поняли депутата Лукашенко в далеком 1991 году. Что тогда? Бегство из страны? Сдача независимости и "отступное" в виде поста вице-президента в тени и под контролем В. В. Путина? Или смерть с "автоматом в руках"?

Очень надеюсь, что самолюбие ПП РБ не позволит ему выбрать ни один из этих вариантов. Хотелось бы верить, что он, преодолев этот грех, найдет в себе силы начать конструктивный диалог с оппозицией. Только восстановление гражданского единства может спасти Беларусь в грядущих испытаниях и дать возможность А.Лукашенко сохранить доброе имя в истории.

У оппозиции есть возможность и обязанность внести свою лепту в проведение успешного диалога. Обязанность перед улицей, молодежью, истосковавшейся по свободе, миллионами людей выразивших ей поддержку во время голосования 19 марта. И огромные возможности, заработанные долгими годами мужественного противостояния диктатуре. Сейчас, когда для всего мира стало ясно, что белорусский народ хочет независимости и демократии, обязанность лидеров оппозиции донести до Вашингтона и Брюсселя свою готовность защищать эти ценности не только на улице, но и за столом переговоров. Свою готовность к компромиссу ради Родины.

Василь Быков сказал когда-то, что сохранив независимость, мы обязательно добьемся и демократии. Наступил момент, когда демократические силы должны ясно сказать и Западу, и Востоку, и белорусскому народу, что мы выбираем независимость со всеми тяжелыми сопутствующими обстоятельствами — экономическим кризисом, газовым шантажом и сотрудничеством с режимом личной власти. Но отказываемся от демократии с "кэгэбистским лицом". От политики денационализации и растворения в массе русского народа.

Но не одни трудности несет выбор независимости. Он несет и уверенность в международной помощи. Быстрых и эффективных реформах. А следовательно, уверенность в быстром подъеме благосостояния. Пословица утверждает, что белорусы медленно запрягают, но быстро едут. Мы можем быстро догнать ушедших вперед соседей, если нам удастся достичь гражданского согласия. В первую очередь с А.Лукашенко и его сторонниками. Ст. Е.Лец когда-то придумал афоризм: "В каждой стране по-своему звучит вопрос Гамлета".

Время, отведенное историей для решения этой сложной, но жизненно важной задачи сжимается, как "шагреневая кожа". Если верить московским авторам, у независимой Беларуси остался только год. А может быть, и меньше года.

РЭАЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА

Пад тапор

Міністэрства спорту і турызму можа ануляваць ліцэнзіі 67 тураператараў за непрадстаўленне справаздачы аб уязным турызме і неажыццяўленне прыёмнага турызму. Пра гэта БелаПАН паведамілі ва ўпраўленні турызму Мінспорту.

Па даручэнні міністэрства на працягу 20 дзён неабходна прааналізаваць дзейнасць кожнага з 67 суб'ектаў гаспадарчай дзейнасці. Па выніках разгляду будуць дадзены прапановы на пасяджэнні калегіі Мінспорту. Спіс ануляваных ліцэнзій турыстычных арганізацый будзе апублікаваны.

Як паведамлялася раней, суб'ектам гаспадарання, якія маюць ліцэнзіі на ажыццяўленне тураператарскай дзейнасці, неабходна было да 20 жніўня 2006 года прадставіць у міністэрства копію статыстычнай справаздачы аб прыёме замежных турыстаў за першае паўгоддзе 2006 года. У выпадку непрадстаўлення або прадстаўлення незапоўненай справаздачы будзе прынята рашэнне абануляванні дзеяння ліцэнзіі на падставе пастановы Саўміна ад 8 чэрвеня 2005 года № 605 "Аб унясенні дапаўненняў у палажэнне аб ліцэнзаванні турыстычнай дзейнасці". Гэтым дакументам было ўнесена дапаўненне, у адпаведнасці з якім асаблівай умовай пры атрыманні ліцэнзіі на ажыццяўленне тураператарскай дзейнасці з'яўляецца абавязковая арганізацыя ўязнога турызму.

Як паведамілі ў Міністэрстве спорту і турызму, на 1 жніўня 2006 года ў Беларусі ажыццяўляюць тураператарскую дзейнасць 474 арганізацыі, якія павінны былі прадставіць у Мінспорт статыстычную справаздачу аб прыёме замежных турыстаў за першае паўгоддзе 2006 года па вызначанай заканадаўствам форме. Справаздачы міністэрству прадставілі 357 тураператараў, у тым ліку 308 юрыдычных асоб і 12 індывідуальных прадпрымальнікаў.

Паводле інфармацыі ўпраўлення, 21 суб'ект гаспадарання прадставіў тлумачэнні па невыкананні патрабаванняў ліцэнзіі, 16 — незапоўненыя справаздачы па графе "Звесткі аб замежных турыстах, якія наведалі Рэспубліку Беларусь". За першае паўгоддзе не аказвалі паслугі прыёму 133 тураператары. З іх 36 суб'ектаў гаспадарання не займаліся прыёмам, бо праходзілі сертыфікацыю, 30 суб'ектаў мелі права не прадстаўляць справаздачу, бо ажыццяўляюць тураператарскую дзейнасць менш чым шэсць месяцаў.

Марына НОСАВА.

КРЫМІНАЛ

Дырэктар аднаго з наваполацкіх прадпрыемстваў абвінавачваецца ў рэалізацыі фальсіфікаванага дызпаліва

Супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю МУС Беларусі выяўлены факт рэалізацыі фальсіфікаванага дызельнага паліва дырэктарам аднаго з прадпрыемстваў Наваполацка. Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў (УІГС) міліцэйскага ведамства.

Кіраўнік прадпрыемства з мая па ліпень гэтага года цераз розныя АЗС краіны пад выглядам дызпаліва збыў сумесь пячнога і рэактыўнага гаручага матэрыялу на суму 79,5 мільёна рублёў. Закупка авіяцыйных ГЗМ праводзілася ў адным з рэспубліканскіх аэрапортаў, пасля чаго ў сховішчы адной з наваполацкіх баз гаруча-змазачных матэрыялаў яны змешваліся з пячным палівам. Па гэтым факце распачата крымінальная справа па артыкуле 257 (падман спажыўцоў у буйным памеры) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі міліцыі затрымалі мясцовага індывідуальнага прадпрымальніка, які з выкарыстаннем фіктыўных пашпартоў якасці нафтапрадуктаў пад выглядам дызпаліва пастаўляў аднаму сталічнаму унітарнаму прадпрыемству пячное паліва. Такім чынам, камерсант нанёс урон прадпрыемству ў памеры 240 мільёнаў рублёў. У ходзе следства па гэтай справе стала вядома, што згаданы грамадзянін займаўся яшчэ і рэалізацыяй няякасных нафтапрадуктаў арганізацыям і прадпрыемствам Віцебскай вобласці, што паступалі да яго з Расіі кантрабандным шляхам пад выглядам бензіну. У бліжэйшы час ён збіраўся збыць 35 тон газавага дыстыляту пад выглядам бензіну маркі "Нармаль-80". Аднак пры вывазе гэтай партыі з тэрыторыі аднаго адкрытага акцыянернага таварыства злачынсік быў затрыманы аператыўнікамі.

Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь нагадвае, што згодна з дзеючым заканадаўствам падман спажыўца цягне за сабой крымінальную адказнасць ажно да пазбаўлення волі тэрмінам да 6 гадоў, а крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі — да 15 гадоў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Народная Воля
1 ВЕРАСНЯ 2006 г.

СЛЫШАЛИ?

В Кремле считают, что Беларусь затягивает решение по цене на газ

"Беларусь тешит себя иллюзиями, что может что-то измениться в позиции "Газпрома" в отношении цены на газ, поставляемый в эту страну", — сказал РИА "Новости" высокопоставленный источник в Кремле. Он отметил, что предложения по цене, сделанные российской стороной, в том числе премьер-министром Михаилом Фрадковым и главой "Газпрома" Алексеем Миллером, были озвучены давно, но ответа со стороны Беларуси так и нет. *"Политическими методами проблему газа ни в этом, ни в другом случае решить не удастся"*, — сказал источник.

Россия планирует поставлять Беларуси газ в 2007 году по цене примерно 180—200 долларов за тысячу кубометров. Такие данные содержатся в письме замглавы Минпромэнерго России Андрея Дементьева, направленном в Госдуму в ответ на запрос относительно обоснованности предстоящего увеличения цены на российский газ, поставляемый в Беларусь.

В ответе Минпромэнерго отмечается, что "по информации ОАО "Газпром" базовую цену газа, поставляемого в Беларусь в 2007 году, планируется рассчитывать по формуле цены, аналогичной для поставки российского газа в Украину (базовая цена, умноженная на индекс изменения цен на энергоресурсы в западноевропейских странах) с учетом нулевой таможенной пошлины для Беларуси (примерно 180—200 долларов за тысячу кубометров)".

В 2002—2004 годах газ в Беларусь поставлялся по внутрироссийским ценам. В 2004 году цена за тысячу кубометров газа, поставлявшегося в Беларусь, составляла 46,68 доллара. В 2005—2006 годах цены на газ не изменялись, несмотря на то что для западноевропейских стран газ подорожал со 131 доллара за тысячу кубометров в 2004 году до 181 доллара в 2005 году.

В документе подчеркивается, что ныне действующая для Беларуси цена газа лишь частично компенсирует удельные затраты на его добычу, подготовку и транспортировку. *"В этих условиях сохранение существующей цены на газ означает не только прямое дотирование поставок газа в Беларусь, но и отсутствие в цене газа источника инвестиций в развитие газовой отрасли, и сокращение отчислений в доходную часть бюджета России"*, — поясняется в тексте.

РИА "Новости".

ИНФОРМАЦИЯ К РАЗМЫШЛЕНИЮ

Чем аукнется для граждан Беларуси повышение цены на газ?

Правительство Беларуси считает, что повышение цены на российский газ для нашей страны должно быть на том же уровне, что и для самой России, и не превышать 11—15%. Об этом на заседании Национального совета по трудовым и социальным вопросам в Минске заявил первый заместитель премьер-министра нашей страны Владимир Семашко.

Он также напомнил, что 25 мая нынешнего года "Газпром" представил "Белтрансгазу" вариант нового договора, где цена на российский газ для Беларуси составляет 200 долларов за 1 тыс. куб.м, что более чем в четыре раза превышает нынешнюю стоимость голубого топлива. По расчетам специалистов, отметил первый вице-премьер, рост цены на газ повлечет за собой увеличение платы за коммунальные услуги. Так, при подъеме цены "до 100 долларов за 1 тыс. куб.м рост коммунальных платежей за двухкомнатную квартиру, где проживают четыре человека, составит 32—35 долларов".

БЕЛАРУСЬ—РОССИЯ

Не на одной ноте

Россия может выйти из соглашения с Беларусью о создании равных условий в области ценовой политики, которое предусматривает применение внутрироссийского тарифа на экспортно-импортные перевозки железнодорожных грузов и поставку в Беларусь российского газа по внутрироссийским ценам. Об этом в российские СМИ сообщили еще в минувшую пятницу, сославшись на источник в "дипломатических кругах".

Напомним, что Соглашение было подписано в апреле 2002 года и на сегодняшний день является главным аргументом Беларуси в переговорах с "Газпромом" о ценах поставки газа в 2007 году. Оно было подписано в пакете с другим договором — о создании совместного с ОАО "Газпром" газотранспортного предприятия на базе белорусского предприятия "Белтрансгаз". По данным российских журналистов, МИД России направил белорусскому МИД ноту, в которой излагается позиция российской стороны относительно дальнейшего участия в этом соглашении с учетом того, что Беларусь не выполняет второе пакетное соглашение.

"Речь не идет о денонсации соглашения о создании равных условий в области ценовой политики, поскольку оно так и не было ратифицировано в России и юридической силы не имеет. Суть в том, что оно должно было быть ратифицировано в пакете с соглашением о создании СП не позднее 2003 года, однако этот вопрос затянулся", — сказал анонимный дипломат нашим российским коллегам. *"Тем не менее российское правительство выполняло свои обязательства по первому соглашению, демонстрируя добрую волю"*, — добавил он. — *А сейчас речь идет о том, нужно ли России дальше придерживаться принципов этого соглашения, в частности, в отношении поставки Беларуси дешевого газа. По железнодорожным тарифам у нас вопросов не возникает. Думаю, возможно, их сохранить, договорившись на межведомственном уровне"*, — сказал источник.

Формальным поводом поднять этот вопрос послужило то, что соглашение было заключено на пять лет (то есть до апреля 2007 года) и предусматривает автоматическое продление, если одна из сторон не уведомит другую о своем намерении прекратить его действие в письменной форме по дипломатическим каналам не менее чем за шесть месяцев до истечения очередного срока.

В Минске, однако, ни о какой ноте ничего не знают. По крайней мере, сотрудники пресс-службы честно признавались журналистам: "Нам ничего не известно о ноте".

Олег СНОВ.

ПАЛІТКУХНЯ

Партыя БНФ канстатуе крызіс

На сойме Партыі БНФ, які адбыўся ў Мінску, была абмеркавана схема выйсця з крызісу кааліцыі дэмакратычных сіл

Як паведаміла прэс-сакратар партыі Кася Маркоўская, усе сябры сойму адзначылі, што сёння кааліцыя перажывае арганізацыйны крызіс і неабходныя прапановы па яе рэструктурызацыі.

Намеснік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч прапанаваў схему арганізацыйнага пераадолення крызісу з выкарыстаннем мясцовых выбараў. Сутнасць яго прапановы ў тым, што ўсе партыі, якія ўваходзяць у кааліцыю, вылучаюць кандыдатаў на мясцовыя выбары шляхам збору подпісаў. Тыя кандыдаты, якія збяруць 500 і болей подпісаў, незалежна ад іх рэгістрацыі на выбарах і вынікаў саміх выбараў пасля іх аўтаматычна становяцца дэлегатамі Кангрэса аб'яднаных дэмакратычных сіл, які прымае далейшыя рашэнні. Такая прапанова павінна стымуляваць актыўнасць і канкурэнтнасць паміж партыямі, прымусіць іх больш эфектыўна працаваць.

"Прычым, як адзначае Віктар Івашкевіч, няма стопрацэнтнай гаранты, што, калі мы прымем гэтую прапанову, у кааліцыі будзе кіраваць Партыя БНФ. Усё залежыць ад працы людзей кожнай асобна ўзятай партыі. Тыя, хто незадаволены сваім месцам у кааліцыі, маюць шанц заняць лепшае месца", — паведаміла К.Маркоўская.

Па яе словах, падчас абмеркавання прапановы В.Івашкевіча на сойме галасы падзяліліся на тых, хто лічыць такую прапанову небяспечнай для пазіцыі Партыі БНФ і Аляксандра Мілінкевіча ў кааліцыі дэмсіл, і тых, хто перакананы, што Партыя БНФ мае ўсе шанцы стаць вядучай сілай у кааліцыі і падняць рэйтынг лідэра дэмсіл. Было прынята рашэнне стварыць камісію з сябраў сойму, якія прытрымліваюцца розных думак па гэтым пытанні. Яны будуць шукаць кампрамісныя шляхі ажыццяўлення прапановы В.Івашкевіча, якая, дарэчы, ужо перададзена для абмеркавання Партыі камуністаў Беларускай, Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Партыі працы, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і іншым суб'ектам кааліцыі.

Марат ГАРАВЫ.

ПОДРОБНОСТИ

Не в ладах со временем

Минский часовой завод "Луч" оказался на грани банкротства

Хозяйственный суд Минска назначил антикризисного управляющего Минского часового завода "Луч". Как сообщили "Интерфаксу" в Хозяйственном суде Минска, 26 июля нынешнего года в суд поступило заявление налоговой инспекции Первомайского района столицы о начале процедуры банкротства Минского часового завода "Луч".

Собеседники агентства отметили, что судом было "принято определение об открытии защитного периода в отношении предприятия, в ходе которого приостанавливаются взыскания, сроком до ноября". Кроме того, по их словам, был назначен временный управляющий, рекомендованный департаментом санации и банкротства Министерства экономики Беларуси.

По информации работников суда, заседание в рамках дела о банкротстве Минского часового завода "Луч" назначено на 23 ноября текущего года. В отделе промышленности комитета экономики Минского городского исполнительного комитета сообщили, что предприятие длительное время является финансово несостоятельным и имеет большую задолженность по основным платежам и другим налогам и сборам. *"Разработан бизнес-план оздоровления предприятия, который предусматривает обновление основного ассортимента продукции"*, — пояснили специалисты, уточнив, что "новая продукция МЧЗ "Луч" будет пользоваться спросом как на внутреннем, так и на внешнем рынках".

Они высказали мнение, что санация предприятия будет способствовать выходу МЧЗ из кризиса, оздоровлению финансово- экономической и социальной ситуации на предприятии.

Минский часовой завод, на котором в настоящее время работает 1,2 тысячи человек, начал выпускать продукцию с 1953 года. Предприятие производит 5 миллионов единиц продукции в год, до 60% объема производства экспортируется.

ЭКСПЕРТЫЗА

Бар'ер на бар'еры

Шэраг існуючых у краіне падстаў для адмовы ў рэгістрацыі прыватнага прадпрыемства "адыёзныя", лічыць саветнік па прававых пытаннях Міжнароднай фінансавай карпарацыі (IFC), заслужаны юрыст Беларусі Валерый Фадзееў.

Як зазначыў юрыст у інтэрв'ю БелаПАН, "існуюць зусім адыёзныя рэчы, многія з якіх незаконныя, немэтазгодныя і азначаюць шырокую магчымасць вырашэнняў з боку чыноўнікаў". У якасці прыкладу эксперт IFC нагадаў адмову ў выпадку, калі "заснавальнік мае судзімасць за эканамічныя злачынствы". На думку В.Фадзеева, "гэта наогул пазасудовае абмежаванне, так званае "паражэнне ў правах". "Як правіла, — зазначае юрыст, — пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю або займаць пэўную пасаду выступае дадатковым пакараннем, што выносіцца рашэннем суда. А тут само па сабе асуджэнне за эканамічныя злачынствы пазбаўляе права выступіць заснавальнікам, нават калі суд не выносіў такога рашэння".

Апрача таго, мяркуе ён, адмовіць у рэгістрацыі можна, калі заснавальнік мае нявыкананыя ў тэрмін грамадзянска-прававыя абавязацельствы па крэдытах і падатках, у той час як, "магчыма, чалавек і стварае прадпрыемства, каб, атрымаўшы даход ад гэтай дзейнасці, разлічыцца з даўгамі", зазначыў В.Фадзееў. Паводле яго слоў, цяпер магчыма таксама адмова ў дзяржрэгістрацыі камерцыйнай арганізацыі "паводле матываў немэтазгоднасці, за выключэннем выпадкаў, вызначаных заканадаўствам".

Усяго ў пераліку падстаў для адмовы ў рэгістрацыі дзевяць пунктаў, паведаміў эксперт. Ён падкрэсліў, што *"зніжэнне рэгулятарнай нагрузкі на малы і сярэдні бізнес — адна з асноўных задач IFC, бо і практыка, і нашы штогадовыя апытанні сведчаць, што адміністрацыйныя бар'еры займаюць адно з першых месц сярод перашкод для развіцця бізнесу ў Беларусі"*.

Алена НАВАЖЫЛАВА.

ПРОДОЛЖЕНИЕ ТЕМЫ

Раскрыта финансовая пирамида в Интернете

Правоохранительные органы Беларуси пресекли попытку создания в сети Интернет финансовой пирамиды. Об этой странной истории мы уже рассказывали.

Некоторое время назад в сети Интернет создан сайт, который незаконно использовал торговую марку (логотип) и данные с официального сайта ЗАО "БелСвиссБанк". Владелец поддельного сайта пытался присвоить денежные средства граждан и организаций. В частности, злоумышленник предлагал посетителям сайта инвестировать их деньги от 1 до 5000 долларов под неестественно высокий процент — от 547 до 766% годовых.

Злоумышленником оказался белорус 1981 года рождения, прописанный в г. Несвиже, но временно проживающий в Минске. В результате санкционированного прокуратурой осмотра места его проживания обнаружены вещественные доказательства, указывающие на причастность данного гражданина к происшедшему.

Задержанный пояснил, что в июле 2006 года он создал веб-сайт, с помощью которого хотел выманивать деньги пользователей через сеть Интернет. Для придания правдоподобности сайту он выбрал при его оформлении логотип ЗАО "БелСвиссБанк". Перевод денежных средств осуществлялся им по электронной платежной системе E-Gold на собственный электронный счет. Правда, посредством незаконной деятельности он успел получить лишь 37 долларов.

Елена НОВИКОВА.

Жнівень 1991: праімперскі путч

(Працяг. Пачатак у №№136—137.)

Сяргей НАВУМЧЫК

Потым ад імя Апазіцыі БНФ Валянцін Голубеў агучыў нашы патрабаванні, у тым ліку — і аб наданні Дэкларацыі аб суверэнітэце статусу канстытуцыйнага закона. Голубеў таксама павіншаваў "усіх сумленных людзей Беларусі, усіх сумленных народных дэпутатаў, усе дэмакратычныя рухі і партыі Беларусі, рабочых, іх страйкавыя камітэты, сялян, інтэлігенцыю, усіх, хто падтрымаў Апазіцыю ў гэты цяжкі час змагання са злачынцамі, з перамогай над фашысцка-камуністычнай хунтай".

У Авальную залу даходзіў роўны, але моцны шум з плошчы ад дзесяткаў тысяч людзей; сотні тысяч, мільёны — слухалі радыётрансляцыю. Валянцін заклікаў людзей далучыцца да тых, хто стаіць на плошчы перад Домам урада: "Ваша падтрымка для нас будзе вельмі важнай у гэтай зале, таму што вы бачыце па выніках галасавання, большасць якіх людзей сядзіць тут".

Наша прапанова аб адстаўцы Дзямянцея была крытычна ўспрынятая Станіславам Шушкевічам, які наогул прапанаваў не абмяркоўваць паводзіны старшыні: "Я лічыў бы немэтазгодным уключаць пункт аб дзеяннях Старшыні Вярхоўнага Савета па адной простай прычыне. Мне здаецца, што Старшыня, нават калі мы зменім старшыню, прабачце, пры гэтым Вярхоўным Савеце ніякіх змен не адбудзецца. І будзе дзень мітусні, і нічога не зменіцца ў становішчы рэспубліканскім".

Гэтыя словы можна лічыць першай публічнай заявай пра мадэль real politic, якая ў будучым наробіць гэтулькі шкоды. Прыкметна, што і фіяска яна пацярпела адразу, як была абвешчаная.

Але Шушкевіч паспрабаваў развіць свой тэзіс у адказ на просьбу Галіны Сямдзянавай пагадзіцца з прапановай Апазіцыі, заявіўшы, што "трэба ставіць тыя пытанні, якія можна вырашыць. І мне здаецца, што марнаваць час на вырашэнне пытанняў, якія немагчыма вырашыць пры дадзеным складзе, не трэба... І мне здаецца, што Апазіцыя павінна зрабіць вывады пэўныя".

Шушкевіч сказаў, што "мы не павінны ўзвінчваць сёння нашы адносіны", і першым пытаннем ў парадак дня прапанаваў уключыць... Саюзны дагавор.

Сяргей Папкоў прапанаваў Шушкевічу "не размазваць парадак дня", паставіць на галасаванне прапановы Апазіцыі БНФ, а Уладзімір Заблоцкі заявіў, што яму сорамна працаваць у Вярхоўным Савеце, старшынёй якога з'яўляецца Дзямянцей.

"**Навумчык С.І.:** — Паважаныя дэпутаты-камуністы! Тое, што прапанавала Апазіцыя, гэта падтрымана дзесяткамі, сотнямі прадпрыемстваў у абласцях, у раёнах. Сёння, калі за дзесяць хвілін да пачатку гэтай сесіі я, вось калега Глушкевіч, калега Трусаў выступалі перад тымі тысячамі людзей, якія стаяць на плошчы, мы іх прасілі (былі заклікі пайсці граміць ЦК і гэтак далей), мы прасілі іх захоўваць спакой: "Мы ўсё вырашым законна, канстытуцыйным шляхам". Дык вы што хочаце? Калі вы гэтыя прапановы не прымеце — дэпартызацыю і народ правядзе, але ён правядзе гэта не так, як мы, культурна, цывілізавана, а ён правядзе, выцягнуўшы вас за валасы".

У перапынку мы, некалькі дэпутатаў БНФ на чале з Пазьняком, пайшлі ў кабінет да намесніка Старшыні ВС Васіля Шаладонава і паспрабавалі пераканаць яго сысці ў адстаўку. Шаладонаў нерваваўся, апраўдваўся... У адстаўку добраахвотна ён не падаў, а большасць дэпутатаў не падтрымала нашу прапанову.

Падчас сесіі Алег Трусаў паказаў Пазьняку копію дакумента — распараджэнне старшыні Дзяржбанка Станіслава Багданкевіча кіраўнікам рэгіянальных філій, дзе загадвалася выконваць распараджэнні ГКЧП. Далей цытую ўспамін Пазьняка:

"Якраз пасля гэтага, у часе перапынку, выпадкова, мы сутыкнуліся з Багданкевічам у Авальнай зале. Ён пачаў мне нешта казаць, даваць нейкія рэкамендацыі.

— Што Вы тут выступаеце, спадар Багданкевіч, трэба яшчэ з Вашай пазіцыяй падчас путчу разбарацца, — кажу.

— В чем разбираться? Как Вы смеете...

Я паказаў копію ягонага распараджэння. Багданкевіч літаральна збялеў, пачаў дрыжачым голасам нешта казаць, апраўдвацца. Я махнуў рукой і пайшоў — не было жадання ўступаць з ім у разборкі, ён ніколі не быў у палітыцы самастойнай фігурай, а як выканаўца — меў імідж неблагога спецыяліста. Я тады падумаў, што ўжо гэтая нашая размова будзе для яго добрай лекцыяй. І ў далейшым Багданкевіч збольшага паводзіў сябе прыстойна". (Забягаючы наперад, адзначу, што ў пачатку 1994 года Багданкевіч разам з Кебічам падпісаў у Маскве пагадненне аб адзінай з Расіяй "рублёвай зоне"; як прыгадвае М.Грыб, на Прэзідыуме ВС нават абмяркоўваўся варыянт арышту членаў дэлегацыі па вяртанні ў Мінск. Праўда, Багданкевіч пры падпісанні зрабіў агаворку адносна адзінага эмісійнага цэнтра, што ўскладніла стварэнне "адзінага рубля". Але магчымасць увядзення "адзінай валюты" з таго часу надоўга зрабілася адной з пагрозаў суверэнітэту.)

Ішла сесія нервова. Адно толькі абмеркаванне парадку дня заняло некалькі гадзін — пракамуністычная большасць упарта не жадала прымаць прапановы Апазіцыі БНФ.

З інфармацыяй аб сітуацыі ў Беларусі выступіў Дзямянцей, заявіўшы, што "Президиум контролировал ситуацию на протяжении всех тревожных дней... исходя из принципа, заложенного в Декларации о государственном суверенитете Белорусской ССР, еще в прошлом году началась работа над проектом Союзного договора... Таким образом, выбор сделан, и неконституционные попытки повлиять на решение Верховного Совета просто авантюристичны. И все же лидеры БНФ не оставляют надежды задержать процесс... Я должен сегодня откровенно сказать народным депутатам и о том, какие угрозы и шантаж пришлось мне и некоторым членам делегации выдержать со стороны Позьняка З.С., Наумчика С.И., Новикова Е.В. перед намечавшимся отъездом на подписание. Нам они с угрозой заявляли, что если не откажемся от участия в официальной процедуре подписания, то народ Белоруссии этого не простит, а я лично буду отвечать как преступник. Как вы знаете, подписание не состоялось из-за ГКЧП". (Цытую па кнізе: М.Дзямянцей. "Уроки жизни", Мінск. БелТА, 2005 г.).

Выступ Дзямянцея пацвердзіў, што асноўная ягоная мэта — падпісанне "саюзнай дамовы".

Неўзабаве да трыбуны выйшаў першы сакратар ЦК КПБ Малафееў — адзіны член Прэзідыума ВС СССР, які адкрыта падтрымаў путч (Старшыня саюзнага парламента Лук'янаў, хаця і быў ідэйным натхняльнікам перавароту, абышоўся двухсэнсоўнымі заявамі).

Малафееў не быў дэпутатам ВС Беларусі, але як народны дэпутат СССР меў права на выступ. Здаецца, ён нават не запісваўся, а неяк падаў знак Дзямянцею, узняў руку і імгненна, не чакаючы рашэння Дзямянцея, упэўнена, як гаспадар, пайшоў да трыбуны. Ніколі раней ён не выступаў на сесіі ВС, не лічыў гэта патрэбным — і вось выйшаў абараняць кампартыю.

І тут мы не стрымаліся. Сама манера паводзінаў Малафеева, іхні змест увасаблялі найвышэйшую ступень нахабства. Не згаворваючыся, некалькі дэпутатаў — Галіна Сямдзянава, Ігар Гермянчук, Барыс Гюнтэр, Віктар Ганчар, Яўген Глушкевіч, Аляксандр Лукашэнка ды я — усталі з крэслаў і ўсталі да трыбуны. "Пайшоў вон! На месца!" — выразы былі экспрэсіўныя, але без "рукапрыкладання". Малафеева мы пальцам не кранулі. Вось толькі адзін дэпутат звяртаўся не да Малафеева, а да нас, імкнучыся "пагасіць страсці", — Аляксандр Лукашэнка. Здаецца, ён нават адцясніў Галіну Сямдзянаву ад трыбуны.

Малафееў быў вымушаны сысці. Гэта было для дэпутатаў-камуністаў псіхалагічным шокам і магутным палітычным ударам — яшчэ ніколі за семдзесят з нечым гадоў панавання кампартыі з асобай "нумар адзін" (фактычным кіраўніком БССР) такога не здаралася.

Пазней Малафееў усё ж атрымаў магчымасць выступіць. Ні слова пакаяння, не намёку на адказнасць, ні нават спробы неяк патлумачыць здраду, апраўдацца (не прызвычаіліся першыя сакратары ЦК апраўдвацца). Малафееў заявіў, што выходзіць з Палітбюро ЦК КПСС і што кампартыя Беларусі будзе самастойнай (а за некалькі месяцаў да гэтага на з'ездзе КПБ адрынаў ідэю стварэння ўласнага, аўтаномнага ад КПСС Статуту). Не забыўся Малафееў і пра маёмасць; як член Палітбюро ён хіба лепш за астатніх ведаў пра перапампоўванне мільёнаў у падстаўныя фірмы і карпарацыі.

Мы працягвалі настойваць на адстаўцы Дзямянцея, членаў Прэзідыума і спыненні дзейнасці КПБ-КПСС. Нашы патрабаванні падтрымала плошча — людзі перад Домам урада не разыходзіліся, далучаліся новыя.

Нарэшце, Дзямянцей зразумеў, што не вытрымае ціску (да дэпутатаў Апазіцыі БНФ далучыліся Уладзімір Кавалёнак, Генадзь Карпенка і іншыя прадстаўнікі "дэмклуба"). Ён заявіў, што падае ў адстаўку. Дзямянцей выступаў эмацыянальна, нават закасаў штаніну і прадэманстраваў голую нагу, у якую быў паранены ў дзяцінстве. Шушкевіч таксама быў расчулены. Сказаў, што шмат чаму навучыўся ў Дзямянцея, што дзякуючы Дзямянцею ў Беларусі не пралілася кроў. Чуць такое было дзіўнавата — у Беларусі адсутнічалі ўсялякія намёкі на міжэтнічныя ці нейкія іншыя ўзброеныя канфлікты.

Адстаўка Дзямянцея з пасады старшыні ВС, якой мы дамагліся, была найважнейшым крокам у справе дасягнення Незалежнасці Беларусі — пазней у сваіх мемуарах Дзямянцей напіша: "Моей подписи под беловежскими соглашениями не стояло бы" (М.Дзямянцей. "Уроки жизни", Мінск. БелТА, 2005 г., стар. 148).

Таксама Шушкевіч, які з адстаўкай Дзямянцея рабіўся вышэйшай службовай асобай, сказаў, што не варта пачынаць паляванне на вядзьмарак. Маўляў, у людзей ёсць сем'і, некаторыя проста не зарыентаваліся ў сітуацыі. Праз дзесяць год, і нават меней, гэтыя чыноўнікі цудоўна зарыентуюцца, падтрымаюць рэпрэсіі антыбеларускага лукашэнкаўскага рэжыму, а пра сем'і і дзяцей рэпрэсаваных, звольненых з працы ды абкладзеных вялізнымі штрафамі беларускіх патрыётаў хваляваца не будуць.

Дамагліся мы і спынення дзейнасці КПБ-КПСС.

Галасаванне было пайменным. Прыкметна, што ў галасаванні па ключавых пытаннях ("Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці", "Аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання Беларускай ССР, дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і ўласнасці Камуністычнай партыі Беларусі і Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі, аб прыпыненні дзейнасці КПБ-КПСС на тэрыторыі Беларусі), па якіх дэпутаты Апазіцыі БНФ галасавалі "за", дэпутат Лукашэнка ўдзелу не прымаў. І не проста не галасаваў (у пратаколе вынікаў насупраць тых дэпутатаў, якія не галасавалі, пазначана "Нг"). Лукашэнка наогул не быў зарэгістраваны і адсутнічаў у зале, і насупраць ягонага прозішча адзнака "Ад" ("адсутнічаў"). Варта дадаць, што галасаванне па асноўных пунктах адбывалася ўвечары 25 жніўня, бліжэй да завяршэння сесіі. Некаторыя замест напружанай працы аддалі перавагу адпачынку ў гатэлі...

Нарэшце, надыходзіць час галасаваць аб наданні Дэкларацыі аб суверэнітэце статусу канстытуцыйнай сілы. Дэпутаты-камуністы ўжо прагаласавалі за спыненне дзейнасці КПБ-КПСС, дэпартызацыю. Здаецца, некаторыя з іх ужо пачынаюць адыходзіць ад шоку і разумець, што занадта ўжо шмат, вельмі празмерна саступілі сваім палітычным апанентам з Народнага Фронту.

Супраць надання Дэкларацыі аб суверэнітэце статусу канстытуцыйнага закону выступіў дэпутат Лукашэнка.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Народная Воля
1 ВЕРАСНЯ 2006 г.

Жнівень 1991: праімперскі путч

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

“**Лукашэнка А.Р.:** — В связи с тем, что вчера и сегодня Центральным Комитетом Компартии республики или по его инициативе вдруг, неожиданно, неспроста начал муссироваться вопрос о том, что Белоруссия должна стать исключительно суверенным государством, я хотел бы заявить следующее. Вчера Михаил Сергеевич Горбачев заявил, что партия должна самораспуститься.

Центральный Комитет нашей партии заявляет о суверенитете для того, чтобы бросить нам кость, пойти на какие-то “уступки”. Я имею в виду прежде всего департизацию правоохранительных органов, органов государственной власти, и тем самым сохранить власть в Белоруссии, используя то, что в Верховном Совете и в Правительстве находится подавляющее большинство их сторонников. Этого позволить мы сегодня не должны.

Второе. Попытка государственного переворота и последовавшие за ним события создали в стране ситуацию, характеризующуюся быстрой эволюцией в сторону демократизации всех сфер жизни общества. В сложившейся ситуации критерием гражданской позиции каждого советского человека является его поведение во время драматических судьбоносных событий, позиция, занятая им. Тем важнее это для государственных деятелей, за спиной которых Белоруссия с ее многомиллионным народом...

События последних дней и часов позволяют сделать вывод о том, что Белоруссия может оказаться в экономической и политической изоляции от России и других республик, занявшим четко выраженную позицию, характеризующуюся резким осуждением путчистов и попытки государственного переворота. По этой причине мы можем быть отвергнуты и Президентом страны Горбачевым, в результате чего окажемся на задворках формирования новых органов управления Союза".

Показальнае слова, ужытае для вызначэння размовы аб суверэнітэце, — “муссироваться”, з пагардай і са здзекам. Канешне, ініцыятарам суверэнітэту ЦК камуністаў ніколі не быў — проста ў тыя дні ўжо было відавочна, што ідэі Народнага Фронту непазбежна ўвасобяцца, і некаторыя з камуністаў імкнуліся “ўскочыць у цягнік”. Заявы Лукашэнкі пра “адказнасць” выявіліся пустой рыторыкай у кантэксце ягоных наступных дзеянняў — члены Прэзідыума ВС, якія падтрымалі путч, падчас ягонага прэзідэнцтва былі прызначаныя віцэ-прэм’ерамі, міністрамі і амбасадарамі. Галоўным у гэтым выступе была якраз спроба перашкодзіць прыняццю беларускай Незалежнасці. Лукашэнка не ўспрымаўся значнай часткай дэпутатаў сур’ёзна, але выказаныя ім тэзы маглі запасці ў галовы тых, хто ў пытанні суверэнітэту вагаўся і, такім чынам, паўплываць на вынікі галасавання.

Рашэнне магло і не набраць належнай колькасці галасоў (а патрабавалася не простая, а “кваліфікаваная”, “канстытуцыйная” большасць — дзве трэці дэпутатаў).

Больш таго: Шушкевіч, прапанаваўшы “давайце заканчваць нашу работу”, выказвае сумнеў у станоўчым выніку галасавання: “Вы ведаеце, канстытуцыйная большасць патрэбна нам. Я б хацеў звярнуць вашу ўвагу, што вельмі цяжка гэта пытанне нават пры самых станоўчых адносінах вырашыць”.

Казаць такое было ані ў якім разе нельга, бо значная частка дэпутатаў пры галасаванні (па любых пытаннях) кіравалася эмоцыямі і была схільная падтрымліваць пазіцыю таго, хто вёў сесію (неістотна, быў гэта Дземянцей, Шушкевіч ці вёў сесію нехта з намеснікаў). Цяпер жа, пасля двух дзён нервовага напружання, дэпутаты папросту былі стомленыя, і нехта мог падумаць — “ну, калі гэта нерэальна, дык навошта галасаваць?” (працэнт тых, хто не галасаваў ці ўстрымліваўся, таксама заўсёды быў значны).

І тут раптоўна, ад мікрафона, выступіў Пазьняк. Гэты выступ у лёсе Беларусі адыграў вызначальную ролю, таму прывяду яго цалкам.

Пазьняк З.С.: “Я хачу зрабіць некалькі заўваг па гэтым пытанні, паколькі тут у зале выступалі некаторыя дэпутаты, у прыватнасці, дэпутат Лукашэнка, які проста заблытаў гэтае пытанне.

Справа ў тым, шаноўныя калегі, што зараз мы ўступілі ў прынцыпова новую сітуацыю. Усе рэспублікі вакол нас аб’явілі аб сваёй нацыянальнай дзяржаўнай незалежнасці. У тым ліку ўчора гэта зрабіла Украіна. Практычна пытанне аб Саюзным дагаворы здымаецца на нейкі перыяд. Саюз існуе толькі намінальна. І калі ў гэтай сітуацыі мы не прымем адпаведнага закона аб дзяржаўнай незалежнасці Беларусі, мы трапім у вельмі кепскае становішча. Таму што тыя рэспублікі, якія вакол нас, яны будуць развівацца, і развівацца як нацыянальныя дзяржавы на прынцыпова новай аснове. Яны ідуць да рынку, у іх будзе больш мабільная эканоміка, і мы трапім у непасрэдную залежнасць ад гэтых рэспублік. Тым больш я ў сваім дакладзе гаварыў (а я дастаткова добра знаёмы з расійскай дэмакратыяй на працягу многіх гадоў) і з усёю адказнасцю магу сказаць, што на Усходзе ў нас фарміруецца маладая агрэсіўная імперыя ў форме дэмакратыі. Тыя дэмакраты, якіх мы добра ведаем, не прызнаюць фактычна нас як нацыю, яны не глядзяць на нас як на асобную дзяржаву і на асобную тэрыторыю, а глядзяць на нас як на вотчыну, на якую яны маюць пэўнае права.

На вялікі жаль, гэта так. І менавіта зыходзячы з гэтых меркаванняў, я неаднойчы выказваўся і пісаў аб тым, што я сумняваюся ў дэмакратычным характары будучай Расіі. Таму што асноўны прынцып дэмакратыі — гэта прызнанне права нацыі на самавызначэнне. Калі ў грамадстве існуе імперская ментальнасць, дасягнуць дэмакратыі поўнасцю вельмі цяжка. І тыя высновы, якія мы можам зрабіць зараз, сутыкаючыся з палітыкай з Усходу, прыводзяць нас да думкі, што зараз нам, каб выратаваць наш народ, нашу эканоміку, абавязкова патрэбен дзяржаўны суверэнітэт. Тыя хуткія тэмпы, якімі зараз пойдуць развівацца дзяржавы, якія заснаваны на дзяржаўнай незалежнасці, яны прывядуць да таго, што іхняя эканоміка высмакча з нашай рэспублікі рабочую сілу, высмакча тавары. І калі ў нас не будзе сваёй валютнай сістэмы (а мы можам яе мець толькі тады, калі будзем мець нацыянальную незалежнасць), мы трапім у вельмі цяжкае эканамічнае і залежнае становішча. Ужо Расія некалькі тыдняў назад паведаміла, Ельцын паведаміў аб тым, што збіраецца павысіць цэны на нафту. Гэта быў у пэўнай ступені шантаж нашай рэспублікі. І ён быў не першы раз.

Калі мы не будзем мець дзяржаўнай незалежнасці, не зможам свае рэсурсы, свае ўсе сродкі, свае вынікі працы ўкладваць на дабро нашага народа і нашай дзяржавы, мы не зможам супрацьстаяць гэтай палітыцы. А яна будзе, і будзе абавязкова.

Мы ўступаем у новы стан дзяржаўных узаемаадносінаў. Таму, шаноўныя калегі, я вельмі вас прашу, паколькі палітычная абстаноўка змянілася рэзка і хутка і некаторыя з нас не паспелі яе адразу ацаніць, я заклікаю ўсіх дэпутатаў зараз ацаніць гэтую абстаноўку самым належным чынам. Таму што ўсякае замаруджванне пойдзе нам на шкоду.

Не трэба баяцца, што тут, як казалі некаторыя дэпутаты, узнікне Албанія, Куба, Карэя. Нічога падобнага. Працэсы, якія пайшлі ў нас, нават ход нашай сесіі, пацвярджаюць: яны неабарачальныя, яны ідуць на карысць нашаму грамадству. А суверэнітэт дасць нам магчымасць стаць свабоднымі і незалежнымі, дасць нам магчымасць развіць тыя асновы, якія мы закладваем, ідучы да рэформ. Я прашу вас паставіць гэтае пытанне і вырашыць яго сёння. Бо заўтра можа быць позна. Нас тут не вельмі многа, і патрэбна канстытуцыйная большасць. Таму я вырашыў выступіць перад вамі, і, можа, для некаторых было гэта нечаканым. Але я дастаткова добра ведаю, якія ўзаемаадносіны ў тых маладых структурах, якія зараз нараджаюцца. І калі мы спаткаемся з імі потым, не падрыхтаваўшыся, мы проста апынемся ў невырашальным стане. Дзякуй за ўвагу".

Гэты выступ Пазьняка потым шматкроць крытыкаваўся ліберальнымі публіцыстамі — у тыя дні Ельцын у грамадстве (як і ва ўсім свеце) успрымаўся выключна як абаронца дэмакратыі, пераможца ГКЧП і камунізму, і было проста немагчыма ўявіць, што дэмакратычную рыторыку выцесняць імперскія амбіцыі. Павінен прызнацца, што ў тыя секунды і ў мяне ўзнікла думка — “Навошта ён так пра Ельцына? Ельцын цяпер на піку папулярнасці” (потым даведаўся, што быў не адзіным дэпутатам БНФ, хто так падумаў. Але ў той момант у Пазьняка не было магчымасці раіцца з намі. Усё вырашалі секунды).

Тут зноў жа падкрэслю, што дэпутаты-камуністы былі супраць незалежнасці Беларусі, але баяліся трапіць пад уладу Ельцына (які забараніў КПСС у Расіі), а на Гарбачова яны ўжо не спадзяваліся. Спадзяваўся хіба адзін Лукашэнка, пра што і сведчыў ягоны істэрычны выступ. Некаторыя стаялі на раздарожжы і не ведалі, што рабіць. Задача выступу Пазьняка перад самым галасаваннем — напалохаць камуністаў Ельцыным, каб прыбаць больш галасоў за Незалежнасць. І настроіць залу галасаваць цяпер, не адкладваючы на “потым” (гэтага “потым”, як паказалі падзеі наступных месяцаў, магло і не быць). Гэтую тактычную мэту Пазьняк выдатна рэалізаваў, што пацвярджаюць выступы нашых апанентаў.

У палітыцы вельмі важная здольнасць аналізаваць з’явы, вызначаць правільныя мэты і паслядоўна дамагацца іх рэалізацыі. Гэтаму, напэўна, можна навучыцца з вопытам. А вось палітычнай інтуіцыі навучыцца нельга. Можна правільна расстаўляць словы і сказы — але каб напісаць “Лілеі” ці “Знак бяды”, трэба быць Барадулі-ным ці Быкавым.

Можна стварыць партыю і нават прывесці яе да ўлады — але для стварэння дзяржавы патрабуюцца іншыя якасці. Шмат разоў у Вярхоўным Савеце (але не толькі ў ім) Пазьняк рабіў крокі, якія маглі падавацца спантаннымі, нечаканымі, нават супярэчнымі традыцыйнай логіцы падзей — але потым, пры спакойным аналізе, яны падаваліся адзіна правільнымі і адзіна магчымымі. Як мінімум двойчы (у ліпені 1990-га, падчас прыняцця Дэкларацыі аб суверэнітэце, і ў жніўні 1991-га, пры наданні ёй статусу канстытуцыйнай сілы), гэтыя крокі вызначылі лёс Беларусі. (Інтуіцыі не пазбаўлены і Лукашэнка, але ў яго яна накіраваная выключна на ўласнае палітычнае самавыжыванне — тым часам як інтуіцыя Пазьняка накіраваная на выжыванне Беларусі.)

Адразу пасля Пазьняка ўстае дэпутат Міхаіл Мачуленка, другі сакратар Гомельскага абкама партыі, — не выходзячы да трыбуны, непасрэдна з сектара, заяўляе, што “я стопроцентно поддерживаю народного депутата Позьняка и предлагаю здесь же, сейчас же проголосовать за то, что он сказал (Апладысменты)”.

Старшыня камісіі па заканадаўстве Дзмітрый Булахаў заяўляе: “Уважаемые народные депутаты! Я боюсь в ваших глазах выглядеть ретроградом, но я стараюсь обосновывать все ваши действия. Я ставлю вас в известность, а дальше принимайте решения сами. Мы нарушаем Конституцию республики”.

Выступае старшыня Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Кулакоў: “Я бы просил тоже поддержать вопрос о том, чтобы мы приняли это решение, потому что действительно положение в экономике сегодня такое, что если нам сейчас не защитить экономически и политически республику, будет хаос и республика пойдет к экономическому краху”.

Старшыня Саўміна Вячаслаў Кебіч: “Я только что имел разговор с очень высокопоставленным руководителем России и должен призвать вас после этого разговора именно принять такой закон, потому что обстановка подписания союзного договора резко изменилась. Вряд ли такое подписание в ближайшее время вообще состоится *(а ўжо праз некалькі дзён праца над ”саюзнай дамовай” аднавілася з яшчэ большым ціскам Гарбачова і сваёй гульнёй Ельцына — вось чаму прымаць рашэнне трэба было адразу. На вераснёўскай сесіі, як, магчыма, планаваў Шушкевіч, магло б і не прайсці. Закон аб Сцягу і Гербе прайшоў голас у голас, але для яго патрэбна было на шэсцьдзесят галасоў менш, чым для Дэкларацыі, бо канстытуцыйнае пытанне прымалася двума трэцямі дэпутатаў.* — **С.Н.**). Поэтому я тоже призываю вас найти такую форму, чтобы не нарушать Конституцию *(а адзіным спосабам якраз і было наданне Дэкларацыі статусу канстытуцыйнай сілы.* — **С.Н.**). Но такой закон надо сегодня принять (*Апладысменты*)".

Былы першы сакратар Ваўкавыскага райкама Міхаіл Жэбрак: “Я до вчерашнего дня стоял за обновленный союзный договор. Но после вчерашнего дня, то, что произошло в Украине, меня заставляет сделать заявление о том, что если мы сегодня не примем такой закон, то, что предлагает Зенон Станиславович, то надо принять тогда решение о входе Западного края в состав Российской Федерации. Другого выхода нет. И Белоруссия не будет существовать, потому что тогда Белоруссии абсолютно не будет”.

Вось ужо і Шушкевіч заяўляе, што раней “лічыў, што гэта будзе неканстытуцыйнай з’явай, што мы зробім нейкія юрыдычныя складанасці і гэтак далей. Але чакаць немагчыма”.

Пазьняк ізноў бярэ слова і па пунктах зачытвае праект, падрыхтаваны дэпутатамі Апазіцыі БНФ, “якая ў пэўнай ступені ўдакладняе тыя заўвагі, якія нам выказаў шаноўны дэпутат Булахаў. Праект Апазіцыі, дарэчы, прадугледжвае і ”нулявы варыянт" у дачыненні да “агульнасаюзнай” уласнасці, і стварэнне камітэта па вызначэнні долі рэспублік — правапераемніц СССР у абавязацельствах і ўласнасці (пазней адзінай правапераемніцай абвесціць сябе Расія, забраўшы і залаты, і алмазны запас, і ўсю маёмасць за мяжой). Але супраць выступіў дэпутат Віктар Ганчар, заявіўшы: “Что касается развернутых предложений Оппозиции, то это уже вопросы, относящиеся к механизму реализации декларации о суверенитете”. А варта было б прыняць нашыя прапановы, бо, прагаласаваныя канстытуцыйна, яны б праз некалькі месяцаў абавязалі і Шушкевіча, і кіраўніка ўрада Кебіча, і міністра замежных спраў Краўчанку на сустрэчы ў Алма-Аце ў снежні 1991-га і іншых самітах патрабаваць долі Беларусі ў “агульнасаюзнай” маёмасці; магчыма, і ў структуры распрацоўкі нафты і газу.

Пачынаецца галасаванне. “За” галасуюць 253 дэпутаты з 265 прысутных (для станоўчага рашэння трэба было 232, дзве трэці ад агульнай колькасці абраных дэпутатаў).

У 20 гадзін 08 хвілін Беларусь вяртае Незалежнасць.

Спраўджваецца мара пакаленняў змагароў за свабоду беларускага народа.

Літаральна на наступныя дні пачаліся абвінавачанні з боку розных прамаскоўскіх лібералаў, што, маўляў, камуністы “скарысталі” БНФ, каб захавацца пры ўладзе, пагадзіўшыся прагаласаваць за Незалежнасць і тым самым утварыць “камуністычны запаведнік”. Рэальнасць жа была іншай — якраз дэпутаты Апазіцыі БНФ скарысталі разгубленасць камуністаў, каб дасягнуць найвялікшай мэты, за якую пакаленні беларусаў плацілі жыццямі. Была адноўлена Незалежнасць, фактычна ўтварылася новая дзяржава. Усё астатняе перад гэтай мэтай выглядае другасным.

На сесіі была ўтвораная Часовая камісія па ацэнцы дзеянняў членаў ГКЧП і грамадска-палітычных утварэнняў, органаў дзяржаўнай улады і кіравання, службовых асоб і грамадзян, якія падтрымалі путч. Кіраўніком камісіі быў абраны дэпутат Апазіцыі БНФ, афіцэр міліцыі Ігар Пырх.

Заклікі “не распачынаць паляванне на вядзьмарак” пачалі гучаць яшчэ на сесіі; гучалі яны і ў прэсе.

“...Сочачы за тым, як праходзіла нечарговая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі, з жалем канстатаваў, што асобным народным дэпутатам яўна не хапала тактоўнасці і культуры паводзін. Лічу, што, абмяркоўваючы ўдзел камуністычнай партыі ва ўказаных падзеях, трэба правесці нейкі водападзел. І не толькі ў адносінах да камуністаў, сярод якіх многа сумленных людзей, але і да ўсіх дзяржаўных і гаспадарчых кіраўнікоў, якія па-рознаму паводзілі сябе ў гэтыя трывожныя дні. І нельга тут дапускаць разгулу страсцей натоўпу, а яны ўжо пачынаюць дзе-нідзе ўсё больш актыўна праяўляць сябе. Няўжо і гэта — культура? Не, гэта пена на хвалях дэмакратыі...” В.Слуцкі, вадзіцель Гомельскай аўтабазы нумар 1". (“Звязда”, 27 жніўня 1991 г.; просты слуцкі кіроўца паспеў прааналізаваць сесію, напісаць ліст і даставіць яго ў рэдакцыю да выхаду нумара — не інакш, асабіста. А супрацоўнікі газеты імгненна падрыхтавалі яго да друку. І ўсё гэта — за адзін дзень (калі Інтэрнета ў Беларусі яшчэ не было).

“Дэмагагічна гучалі на сесіі заявы тых членаў Прэзідыума, якія сваю дваістую, згодніцкую пазіцыю тлумачылі выключна клопатам аб спакоі і захаванні парадку на Беларусі. Не выключана, што ў хуткім часе газеты пачнуць пісаць і пра цкаванне былых партыйных сакратароў, а то і простых камуністаў. Усё гэта ўжо было ва Усходняй Еўропе, ёсць у Прыбалтыцы. Няўжо чужы вопыт нічому нас не навучыў?” — пытаўся Валянцін Жданко ў артыкуле “Не плюйце ў твары партакратам!” (тая ж “Звязда”, 27 жніўня 1991 г.).

Як вядома, хваляванні былі дарэмныя — ніхто нікога не цкаваў. Ігар Пырх публічна заявіў, што “паляванне на вядзьмарак” не будзе. Ён сур’ёзна ўзяўся за справу, праз некалькі месяцаў зрабіў папярэднюю справаздачу, у выніку якой парламенцкая большасць палічыла за лепшае спыніць працу камісіі.

Для нас, дэпутатаў Апазіцыі БНФ, з завяршэннем сесіі пачынаўся новы этап працы — трэба было ствараць уласную грашова-фінансавую сістэму, уласнае войска, памежныя службы, неадкладна распачынаць рынкавыя рэформы, каб стварыць гарантыі суверэнітэту і пазбавіцца залежнасці ад Масквы.

...Гэта была самая кароткая — і самая вызначальная — сесія Вярхоўнага Савета 12-га склікання; магчыма, у гісторыі Беларусі ёй будзе адведзена месца адной з найвялікшых гістарычных падзей XX стагоддзя. Яна запатрабавала не толькі інтэлектуальнай, але і нервовай, эмацыянальнай напружанасці і вялікай палітычнай працы.

А на плошчы перад Домам урада не разыходзіўся народ — тысячы людзей пад Бел-Чырвона-Белымі Сцягамі віталі Незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны.

“Я не чакаў, што мы так дружна і так слаўна закончым сесію, — заявіў Станіслаў Шушкевіч журналістам БелТА. — Прынятыя законы — самая вялікая радасць і нечаканасць. Мне нават хочацца верыць, што адпадзе пытанне аб новых выбарах... Паглядзіце на твары народных дэпутатаў. Яны сталі іншымі, яны шчаслівыя. Я знаходжу гэта цудоўным. А цяпер, прабачце, спяшаюся на маскоўскі цягнік...”

Хітрыкі...

Служба ўласнай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама будзе звяртаць павышаную ўвагу на супрацоўнікаў міліцыі, якія незадоўга да звальнення з органаў унутраных спраў губляюць свае службовыя пасведчанні.

Як паведамілі БелаПАН у ГУУС, такія меры звязаны з тым, што апошнім часам выяўляюцца факты выкарыстання звольненымі супрацоўнікамі органаў унутраных спраў сваіх службовых дакументаў або іх копій з мэтай, напрыклад, бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце, бясплатнай паркоўкі аўтамабіляў. У Мінску за апошнія паўтара года выяўлена сем выпадкаў выкарыстання падробных міліцэйскіх пасведчанняў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Як у анекдоце

Амаль анекдатычны выпадак адбыўся на тэрыторыі, падведамаснай Крупскаму раённаму аддзелу ДАІ. Невядомыя за адну ноч скралі 14 дарожных знакаў з трасы Брэст—Масква. Няўжо нехта ўспомніў анекдатычную гісторыю пра тое, як начальнік замест прэміі выдаў даішніку знак абмежавання хуткасці “40", і вырашыў падзарабіць?

Кошт скрадзеных знакаў складае 1,16 мільёна рублёў.

Вольга БАРЫСАВА.

З-ЗА КРАТАЎ

Севярынец не раскаяўся,

таму яго вырашылі пакінуць у калоніі

Аднаму з лідэраў дэмакратычнага руху Беларусі Паўлу Севярынцу адмоўлена ва ўмоўна-датэрміновым вызваленні. Такое рашэнне прыняла атэстацыйная камісія папраўчай установы адкрытага тыпу № 15, на думку якой Севярынец не раскаяўся ў зробленым.

Нагадаем, што ў маі мінулага года суд Цэнтральнага раёна Мінска абвінавачваў Паўла Севярынца ў арганізацыі 18—19 кастрычніка 2004 года ў Мінску масавых несанкцыянаваных выступленняў супраць афіцыйных вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. Палітыка прыгаварылі да трох гадоў абмежавання волі, але пасля ў сувязі з амністыяй гэты тэрмін быў скарочаны на год. Са жніўня 2005 года Севярынец адбывае пакаранне, працуючы ў лясгасе. Ён жыве ў інтэрнаце вёскі Малое Сітна Полацкага раёна Віцебскай вобласці.

Ірына ЛЕЎШЫНА.

АЗБУКА ПОЛИТОЛОГИИ

Миф о едином народе

В Беларуси нет и не должно быть политики и политиков. Это один из базовых принципов доморощенного авторитарного режима. Даже тот, который у нас все и за всех решает, от звания политика периодически открещивается. И не удивительно: политика — понятие западное. Она сводится к согласованию интересов различных структур общества. Но в Беларуси, если согласиться с официальной версией, таковых нет.

А что есть? Есть народ, как единая общность суверенного белорусского государства. Вообще-то тут требуются кавычки, поскольку данную мысль я позаимствовал у далеко не последнего человека в государстве (если судить по должности и научному званию). Еще бы — А.Рубинов, первый заместитель главы Администрации президента, академик .

Пишите письма

Если в вашем доме протекает крыша, то для устранения дефекта рекомендую обратиться лично к Лукашенко. Не стесняйтесь. Сотни тысяч соотечественников, находящиеся в здравом уме и твердой памяти, ежегодно так и поступают, поэтому письма в Администрацию приходят мешками. В стране, выражаясь языком политологии, между властью и обществом подписан вертикальный социальный контракт. Последний может быть и горизонтальным, но тогда для ремонта дырявой крыши жителям дома пришлось бы не писать письма, а собраться всем вместе, обсудить проблему и самим же ее решить.

От такой бытовой активности рукой подать до активности политической, т.к. любое объединение людей для совместного решения проблем есть структура гражданского общества. Власть этого боится и всеми силами старается удержать нас в атомизированном состоянии. Пока ей это удается. Вот как эту житейскую политологию сформулировал однажды сам Лукашенко: *“Политический итог — основные претензии людей к действующей власти из-за жилищно-коммунального хозяйства”.*

Перед ЖКХ мы все равны и одновременно все едины. Мы народ, мы единая общность суверенного белорусского государства. Развивая данную мысль, академик А. Рубинов в частности пишет: *“Сегодня в нашей стране нет серьезных конфессиональных, национальных или классовых противоречий и антагонизмов. Все граждане и жители Беларуси чувствуют себя совершенно равноправными, ни на ком не стоит печать второго сорта, как в некоторых других странах”.*

Музыка не патрабуе перакладу, паэзія не перакладаецца. Геніяльны паэт роўны самому сабе толькі на сваёй мове. Рыгор Барадулін якраз гэткі паэт, роўны самому сабе адно па-беларуску. Зрэшты, як і народ роўны самому сабе толькі на сваёй зямлі з усім сваім.

Яно не азначае, што не трэба мкнуцца ў свет... Яшчэ як трэба — мы і так ужо ўсіх перасядзелі ў лясах ды балотах. Пакуль выжывалі — жыццё ішло.

Што істотна, для Барадуліна не існуе калізіі паэт і народ. Прынамсі гэтак, як існавала яна для Купалы: "Па колькі нам дасі чырвонцаў, калі мы пойдзем за табой?.." Калі Барадулін і вылучае сябе з народа, дык толькі тым, што, пакуль народ спіць, ён робіць ягоную народную работу: мовастваральную. Прачнуўшыся, народ знойдзе ў Барадуліне тое, што і не сніў.

Уявіце, якім выданнем з выданняў стане некалі слоўнік мовы Рыгора Барадуліна. З якога хтосьці дазнаецца, што ўручча — не адно мікраараён Менска, дзе чамусьці няма ручаёў.

Нязмушанасць метафары, палётная лёгкасць радка, электрычнай дугой са словам счэпленае слова — гэтак паўстагоддзя таму пачынаўся Рыгор Барадулін. Кнігамі "Нагбом", "Неруш", "Рум", "Абсяг"... У маладосці — пры гульні з Богам і Вечнасцю — яно не дзіва: кіпень вершаў. Але і ва ўзросце сямідзесяці гадоў, калі пачуваешся "як беспрытульны дым, перад якім пазачынялі дзверы", ён стварае "Ксты" — кнігу-малітву, кнігу духоўнай паэзіі, пранізаную энергетыкай. Выпадак зноў жа, як амаль усё, што звязана з Барадуліным, фенаменальны.

Кніга "Ксты" яшчэ на вянец, амаль да даху ўзвысіла сцены храма, які ўсё жыццё ўзводзіць Рыгор Барадулін. Але да крыжа — далёка, да неба — высока... І ён піша новыя вершы, кладучы на вянец "Кстоў" вянец "Рунаў Перуновых".

Гэткае дойлідства заслугоўвае не абы-якой адзнакі... Пасля прэзентацыі кнігі "Ксты", якая адбылася ў Менску ў касцёле св. Сымона і св. Алены, усе прысутныя там разам са святарамі прыйшлі да думкі, што такой адзнакай магла б стаць Нобелеўская прэмія. На што ўсе разам, памаліўшыся, і пачалі працаваць.

Дай Божа, каб праз Рыгора Барадуліна (як і праз Васіля Быкава, чаго, на жаль, не сталася, не паспелася) Нобелеўскай прэміяй узнагародзілася ўся наша нацыянальная культура, літаратура, паэзія, а найперш — мова. Тая самая, якая выстаяла, выжыла насуперак знішчэнням. Тая самая, праз якую мы — не на пустым месцы. Тая, якая для Рыгора Барадуліна — ад мамы Голас. Урэшце, тая, на якой чуе нас Бог — і ці прымае, ці не прымае нашы малітвы.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ,
паэт, старшыня Беларускага ПЭН-цэнтра.

Рыгор БАРАДУЛІН

З новай кнігі «Руны Перуновы»

***

Вусны ўзносяць да неба — а іхны
язык па зямлі валачэцца.

Псальм 72:9

У вуснаў ёсць дамова з языком
Пра гэта змоўчыць цішыня нямая.
Язык трымацца мусіць пад замком,
А неспасціжны ключ душа трымае.
Бо вусны — вусце думкі,
Што сама
На выйсце просіць у душы дазволу.
На думку кратаў і замкоў няма.
Бянтэжыць думка ерась і крамолу.
Душа — гняздоўе
Прыцемку й святла.
Хто ўзважыць,
Што ў душы пераважае.
Не раз палону тлен перажыла
Душа.
Яна й твая табе чужая.
Часовыя,
Не ведаем, калі
Душа пакіне нас,
Як думка высі.
Але язык не вінен па зямлі,
Як пуга пастухова, валачыся...

***

Бо не ад усходу і не ад захаду
і не ад пустыні ўзвышэнне...

Псальм 74:7

Не ўзвышэнне сябе самога,
А ўзвышэнне з самога сябе.
Непадсільная перамога
У няскончанай барацьбе.

Не ў дагоду
Сцежка з усходу,
А ў халодную ноч вядзе.
Захад захады робіць,
Выгоду
Выглядае сабе кагадзе.

І спякотны вецер з пустыні
Не асушыць слёзы з вачэй.
Дол нагрэецца ды астыне.
Разбаліцца боль балючэй.

Над забытасцю, над імшою,
Над прадоннем цёмнай маны,
Над спустыненаю душою
Мусіць голас узвысіць
Нямы.

Мелкія ў суцяшэння кішэні,
Хто не клаў у іх, той дастае.
Узвышаймася.
Бо на ўзвышэнне
Вышыні ў нябёсаў стае!



***

Я зрабіўся як сыч у руінах...

Псальм 101:7

Руйнуе нявечнае час —
Усё, што з граніту ці з гліны.
Руйнуе сівыя руіны,
Трымае нібы напаказ.

І людзі,
І птушкі, й звяры —
Жывыя руіны руінаў.
Пакінуў іх Бог для ўспамінаў
Пра страчаны рай да пары.

Высока сябе несучы,
Сплываюць вякі ды аблокі.
І страх,
Быццам сыч вірлавокі,
Турбуе руіны начы.

***

Сонца ведае свой захад.

Псальм 103:19

Дні на зямлі твае,
Як дзень адзін.
Калі ён скончыцца —
Ніхто не скажа.
Ты знікнеш —
Не заўважыцца прапажа.
Рацэ няўцям,
Як шмат растала льдзін.

Твой цень апошні
Цемра ахіне.
І ўжо не зразумееш,
Дзе ты, хто ты,
Іад цябе ў маўклівай старане
Адступяцца надзённыя турботы.

Пакуль твой дзень,
Старайся ўсё паспець,
Бо дарабляць не вернешся,
Магчыма.
Пакуль заход
Яшчэ не хоча цьмець,
Кон пазірае добрымі вачыма.

І сонца —
Служка боскай мілаты —
Стараецца шчырэй
Разліць лагоду,
Яно свой захад ведае,
А ты
Не ведаеш ні захаду, ні ўсходу.

***

Ці на неба ўзыду — Ты там;
ці сыду ў апраметную —
і там Ты.

Псальм 138:8

Ты са мною
І ў радасці, і ў бядзе,
І ў сумятні віратлівай,
І ў цярплівай маркоце.
Тваё павадырства
Па свеце вядзе,
Ты крылле, як ластаўцы,
Даеш душы на адлёце.
Ты са мной,
Каб не быў я ў самоце нідзе.
Ласка Твая маладая
Ад знянацкай надзеі.
Кара Твая відушчая ведае,
Дзе
Жыве дабрыня,
Дзе ліха лішаць ліхадзеі.

Я да скону ў палоне Тваім,
І пасля
Папрашуся застацца
У вечным палоне душою.
Я з Табою,
Пакуль мяне носіць зямля.
І калі перастану быць,
Застануся з Табою.

Нашча

Туман пакут скроні часу выбеліў.
Кайнасць запозненая замаўчала.
Мама —
Мая небадарная Біблія,
Якая мяне да жыцця прыручала.

Грахоў неадольных
Прадонная яміна
Разяўлена, як галодная пашча.

Жыве ўва мне
Кожнае слова маміна.
Біблії ўдзячны,
Малюся нашча...

ПАМЯЦЬ

Запаленае ім святло — нязгаснае

*2 верасня — сорак дзён як Беларусь страціла свайго вялікага сына, народнага пісьменніка **Янку БРЫЛЯ***

Той свет, які стварыў у сваіх кнігах класік нацыянальнай літаратуры Янка Брыль, гэта свет найвялікшых духоўных каштоўнасцяў: праўды, дабрыні, высакародства. Да іх заўсёды будзе імкнуцца чалавек, пакуль будзе на Зямлі само чалавецтва.

Вось чаму ў пошуках радасці людзі будуць цягнуцца да твораў вялікага майстра слова, да незвычайнага багацця, хараства і святла яго душы.

Івана Антонавіча ўжо няма з намі. Яшчэ не суцішыўся — і ці суцішыцца калі? — востры, пякучы боль ад невымернай страты. Але пакуль мы помнім — ён жывы!

Радзім ГАРЭЦКІ

Апошнія сустрэчы: у сэрцы назаўжды

25 ліпеня аглушыла вестка пра смерць Янкі Брыля. А яшчэ ж за гадзіну-другую да яго канчыны дактары абнадзейвалі дачку Наташу: "состояние удовлетворительное"...

Якраз на той час я быў у той жа бальніцы, ды не ведаў, што ў гэты момант пакідае свет дарагі мне чалавек. Мой лепшы сябра, Вялікі Беларус... Быў упэўнены, што Іван Антонавіч зараз на лецішчы ў Крынічным, і з радасцю чакаў сустрэчы там на яго 89-ы дзень народзінаў 4 жніўня. Крыху раней мы з вядомым музыкам Уладзімірам Пузынем наведалі Івана Антонавіча ў бальнічнай палаце, ён быў хаця і з кіёчкам, але вельмі бадзёры. Мы многа жартавалі, смяяліся. І другім разам, ужо ў іншым пакоі з шыльдачкай "Палата ВОВ", ён быў спакойны і добразычлівы. За цікавай гамонкай хутка бег час. Кожны дзень яго наведвалі клапатлівыя дочкі Наташа і Галя, яго ўнукі і родныя, прывозілі газеты, часопісы, і ён быў у курсе галоўных навін.

Цяжкую аперацыю перанёс мужна, але тры дні адыходзіў ад наркозу, трызніў. І ўсё ж настрой у яго быў аптымістычны. Падарыў нам сваю нядаўна надрукаваную кнігу "Птушкі і гнёзды. Выбранае" з серыі "Беларуская проза XX стагоддзя". Яму было прыемна бачыць такое добрае, прыгожа афармленае выданне. Надпіс зрабіў, як заўсёды, кароткі і ёмісты: "Радзіму і Галі — з любоўю. Я. Брыль". Пісаў, лежачы з кропельніцай. Смяяўся: "Ніколі не рабіў надпіс такімі каракулямі".

Размаўляў пра самае роднае: змест апошніх "Дзеяслова", "Нашай Нівы", "Народнай волі", падзеі ў свеце. Як заўсёды, трапна ўстаўляў штонебудзь з любімага Льва Талстога. З цеплынёй расказваў пра сваіх "замежцаў" — сына Андрэя з жонкай у Японіі і ўнукаў у Італіі. Казаў, што адпраўляюць у Аксакаўшчыну падмацаваць здароўе. Зазначыў, што там пісаць, напэўна, не будзе, бо троху ўжо "выпісаўся", а слова класіці на паперу трэба не спяшаючы, прадумана, для гэтага неабходна назапасіць думкі, пачуцці...

7 ліпеня — зноў радасць: пазваніў Іван Антонавіч. Вярнуўся дадому пасля рэабілітацыі, збіраецца ў Крынічнае.

***

Перад ад'ездам Янка Брыль разаслаў сваю новую кніжку "Парастак" амаль па 60 адрасах! Мы таксама атрымалі: *"Дарагім Радзіму і Галі з сяброўскай прыхільнасцю. 8.VII.06. Я. Брыль"*. Ніколі і не думаў, што гэтая кніжка стане развітальнай і ў нейкім сэнсе дойдзе да нас як запавет.

Якая цудоўная, сімвалічная назва! Гэта — зварот да сваіх вучняў, чытачоў, прыхільнікаў, да маладых парасткаў, якіх у пісьменніка за яго доўгае і плённае жыццё вырасла мноства. У кніжцы вялікі майстар прозы і асабліва мініяцюр зноў шырока і шчодра расчыніў браму сваіх багатых скарбаў. Тут невымерная любоў да беларускай прыроды, да Нёманшчыны; мудрыя філасофскія развагі пра жыццё, Радзіму, пра ўвесь свет. Пра сённяшні стан нашай мовы, мінулае і будучае краіны. Пра сяброў, пісьменнікаў і мастакоў. Шчырая споведзь пра сябе і свой радавод. І ўсё напісана прыгажэйшай, адшліфаванай да бляску брылёўскай мовай. Каб усё дайшло да глыбіні розуму і сэрца, трэба кніжку чытаць і перачытваць вельмі ўдумліва.

Проста ўражвае, як ён умеў поўнасцю зліцвацца з прыродай, быў надзіва наглядальным і замілаваным кожнай праявай прыгажосці ці то ў дрэве, ці то ў травінцы, птушцы, рэчцы, закаце і ўсходзе сонейка... Яго апісанні малюнкаў прыроды — сапраўдныя лірычныя вершы ў прозе.

"Малы хлопчык увечары адзін выходзіў на ганак дома на лецішчы. Стаяў і ціхенька, зачараваны, любаваўся роўным месяцам, зоркамі, небам...

Краса прыроды глядзіць на самую сябе яшчэ аднымі шчырымі, наіўнымі вачыма".

Ці яшчэ:

"Крыху здалёк ды знізу гляджу на адну з маладых, стромкіх бярозак і думаю, што каб я мог, умеў напісаць дзіцячую казку, яна пайшла б ад імя самаго найверхняга лістка, — як ён глядзіць навокал. Чым любуецца, што хоча сказаць...

"Высокая, цёмна-зялёная сцяна маладога бярэзніку са стромкімі пражылкамі берасця-на-белых гонкіх сталовуў у густой лістоце. Зводдаль, знізу відно, як на фоне гарэзліва, штуршкамі клубіцца, подыхамі іграе хваліста-празрыстай павалокай сінявата-светлы дым нябачнага за кустамі вогнішча.

"Пройдзе як дым". Пра быстрацечнасць жыцця.

Але ж і гэтае адчуванне красы, зачароўваючы рухам, хвалюе і застаецца. У памяці".

Успамінаю, з якой любоўю і захапленнем ён знаёміў нас з дубамі, што магутна і прыгожа раскінуліся недалёка ад Нёмана, каля Крынічнага. У кніжцы — пра іх:

"Дубы... Дубы... [...] Ужо на працягу блізу дваццаці гадоў, вядучы новых ды новых гасцей да бацькі Нёмана, я паказваў ім на прыдарожным пні нявінна смелае беразанятка, пасля, праз іншыя дачныя леты, хваліў бярозку-падростка, а сёння ўжо, дарагія мае, мы з вамі палюбаваліся сталай красуняй!.. Дык возьмем яшчэ на кроплі і за бярозу на дубе. З ягонай сілай і з яе красой!..."

Пісьменніка хвалявала і не давала спакою мінулае.

"Як баяўся Купала — пры Сталіне, і як баяўся Дубоўка — пасля Сталіна, пра што яшчэ як трэба не напісана".

Мы часта з Іванам Антонавічам разважалі і ўспаміналі тыя часы бальшавізму, і мне прыемна, што ў гэтай кніжцы ёсць такія радкі.

"Кніга ўспамінаў Міхася Ганчарыка і кніжачка ўспамінаў пра яго. Пра іх нядаўнюю прэзентацыю мне расказваў Радзім Гарэцкі, цёпла ўспамінаючы бацькавага сябра, чалавека з падобным лёсам сталінскага пакутніка, які ўсё ж змог нямала зрабіць у айчыннай батаніцы, як Гаўрыла Гарэцкі ў геалогіі".

Брыль не любіў траскатні, паказухі, гучных дыфірамбаў, афіцыйных юбілеяў. Быў надзвычай сціплы, хаця разумеў сваё месца ў літаратуры. Не дапускаў шуму-пахвалы ў адносінах да сваёй асобы і наогул не надта ўхваляў такое.

"Старэйшы беларускі пісьменнік. Жыве і працуе ў Мінску. Яго апошняя кніга..."

Бібліяграфічная даведка пра мяне ў "Arche", да змешчанага там эсэ.

Спачатку гэта трохі незвычайна, а потым можна і ўздыхнуць з палёгкай, — настолькі яно лепш за ўвесь набор эпітэтаў, якімі кішыць сённяшняя літаратурная паказуха, дзе і абстрактныя геніі, і па-савецку народныя, і па-постсавецку культавыя, і на польскі лад слынныя і выбітныя, і да нашай правінцыяльнасці эпахальныя ды сусветныя, нават "нобельскія", і па-біблейску апосталы ды прарокі... І яшчэ не ўсё ў пераліку!.."

Паспрабуй не пагадзіцца.

Пра сябе ён піша шчыра, бясстрашна і самакрытычна.

"Мой колішні часовы сацрэалізм вінаваты яшчэ і ў тым, што напісаў я мала, залішне ходзячы, як кот вакол гарачай місы, каля якое-небудзь новае задумы, — а ці тое? а ці так? — замест таго, каб проста пісаць, "что Бог на душу положит". Як пісалі, скажам, Чэхаў ці Шолам-Алейхем... Бо якраз чытаючы яго весела жывучыя апавяданні, яшчэ раз падумалася пра маё малапісанне".

...Іван Антонавіч быў вельмі шчаслівы сваёй сям'ёй. Мілая Ніна Міхайлаўна, верная спадарожніца жыцця — такая разумная, адукаваная, абаяльная, з тонкім гумарам, сапраўдная дарадчыца ва ўсім. Ёй Іван Антонавіч прысвяціў пяшчотныя радкі ў нарысе "Нашы разлукі" (2004). Цудоўныя дзеці — Галя, Наташа, Андрэй і, канешне, унукі, якіх вельмі любіў і ганарыўся імі. З радасцю піша: *"А ці ж гэта не навагоднія падарункі — сынаў званок з Японіі, а ўнукаў з Італіі? З сынам кароткая гутарка, а ад унука, праз хрып і трэск у тэлефоннай трубцы, толькі: "Дзяду-ля!.." На чым сувязь і абарвалася. Але ж мне і такога нямала".*

Памятаю, як я, аддаўшы свой артыкул у рэдакцыю "Роднага слова", вырашыў зайсці да Івана Антонавіча, якому рэдакцыя заказала нарыс пра радавод. Ён яго закончыў, разам з Наташай падабраў здымкі. Калі я прыйшоў, ён паведаміў: "А ведаеш, дарагі мой, павіншуй мяне — я стаў прадзедам!" Я адразу спытаў: "А ў "Радавод" паспеў уключыць новага чалавека брылёўскай крыві?"

У часопісе, а зараз у кнізе "Парастак" з успамінам пра тую сустрэчу прачытаў: *"Вясёлы пастскрыптум. 10 красавіка, калі ўжо гэты нарыс быў здадзены ў рэдакцыю часопіса "Роднае слова" і прыняты да выхаду ў чэрвені, я на шэрай гадзіне, не ўключыўшы святла, у адзіноце спяваў сам сабе, у нейкія моманты нават у слёзнай асалодзе ад музыкі і слоў — родных, рускіх, украінскіх, польскіх. І тут нечаканы і доўгачаканы званок ад Галі, што вось і яна ўжо бабуля, а я — такім чынам, прадзед!.. У Мішы з Машай — дачушка, імя якой падрыхтавана бацькамі загадзя — Даша. Дар'я, а ў нас пагорску — Адарка, Адара. Зноў жа высокае хваляванне, святочная навіна, пра якую мне захацелася дапісаць. Бо яна ж і да месца ў размове пра мой, пра наш радавод".*

Былы жаўнер і партызан, які зведаў жудасці вайны, разлад паміж людзьмі і дзяржавамі, які цэніць мір і сяброўства, марыць пра будучае сапраўднае наасфернае жыццё, Янка Брыль у апошняй кніжцы, нібы звяртаючыся да ўсяго чалавецтва, зазначыў: *"Эфіопа-рускі Пушкін, беларуса-паляк Міцкевіч і многа другіх выдатных і добрых, у той ці іншай міжнацыянальнай сумесі — хіба ж і гэта не кліча ўсіх людзей да разумнага аб'яднання, да шчасця міру паміж імі?*

Нянова гэта ў мяне. Але ж і праблема штодзённа-вечная".

***

І вось 25 ліпеня — неспадзяваны, страшэнны ўдар. Дагэтуль хаджу сам не свой. У галаве: "Іван Антонавіч! Янка! Як жа так? Чаму так? Як будзем без Цябе?" Беларусь і ўвесь свет асірацелі: пайшоў ад нас Вялікі пісьменнік, Вялікі грамадзянін. Але суцяшае адно: ён жа назаўсёды з намі.

І зноў на памяці — сустрэчы даўнія і блізкія. Напрыклад, наша вандроўка з Нілам Гілевічам і яго Нінай Іванаўнай у Крынічнае на 80-годдзе Івана Антонавіча. Так было радасна, весела, столькі казалі яму добрых сардэчных слоў. Ад душы, па-братэрску... Мы разумелі Івана Антонавіча, які тады быў задаволены тым, што з нагоды юбілею ўлады, дзякуй Богу, не ўздумалі адзначыць яго якой узнагародай. Хаця я, прызнаюся, быў абураны ніякім стаўленнем да аднаго з самых выдатных людзей краіны.

(Пазней ад нас назаўсёды пайшла адна Ніна, а за ёй у хуткім часе і другая...)

Калі маёй стрыечнай сястры Галіне Максімаўне, дачцэ Максіма Гарэцкага, якой ужо за 80, бывае блага, яна прымае самы надзейны лек: бярэ кніжку Янкі Брыля. Гаворыць: дапамае! Ды хіба толькі ёй? Ад кніг класіка, такога іскрыстага, прамяністага, ідзе жывое нязгаснае святло. Думкі, дух, словы Янкі Брыля будуць жыць вечна. Будуць захоўваць беларушчыну, дапамагаць будаваць вольную, дэмакратычную, цывілізаваную дзяржаву з прыгожай назвай Беларусь, аб якой усё жыццё ён марыў.

Радзім ГАРЭЦКІ,
акадэмік.

На здымку: *сябры (злева — Янка Брыль, справа — Радзім Гарэцкі.)*

Дзякуй Богу, што ён быў

Дарагі чалавек адляцеў у вечны вырай. І гэта заўсёды сумна. Гэта цяжка, вельмі цяжка ўсвядоміць. Але дрэва, пасаджанае ім, расце і будзе ўзвышацца ўсё вышэй цягам гадоў.

Роднае слова для генія было ўсім. І мы яго так і ўспрымаем: гэта — Літаратура, гэта Школа, гэта Жыццё. Няхай яно будзе вечна! А ён зойме ў нашым сэрцы і народнай памяці месца побач з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Уладзімірам Караткевічам, Васілём Быкавым. І мы дзякуем Богу, што ён быў. І ён будзе!

Мікола КУПАВА,
мастак.

Такія не ўміраюць

Сыходзяць Волаты далёка,
ў вечнасць,
А мы упэўнены: яны — між нас,
бясспрэчна!
Сыходзяць Волаты ў нябыт,
ды не ўміраюць,
Бо людзям сваё сэрца
пакідаюць,
Каб не згубіў надзею
беларус,
Што будзе вольнай,
незалежнай
Беларусь!

Фелікс ШКІРМАНКОЎ,
удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.
г.Слаўгарад.

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

Хто самы багаты спартсмен?

Падкажыце, калі ласка, хто з'яўляецца самым багатым спартсменам Беларусі?

Мікалай Андрэйчанка, Брэст.

— Спартсмены не вельмі любяць, калі ім зазіраюць у кішэню. Але скажу: больш багатыя тыя з іх, хто выступае за мяжой. Тэнісіст Максім Мірны, футбаліст Аляксандр Глеб, хакеіст Руслан Салей... Іх заробак пералічваецца сотнямі тысяч, а то і за мільён долараў у год.

Напрыклад, зарплата Аляксандра Глеба ў Арсенале складае 46 тысяч долараў у тыдзень. Максім Мірны займае 12-ы радок у спісе самых багатых тэнісістаў свету. Сёлета, без уліку падаткаў, ён зарабіў больш за 800 тысяч долараў. Хакеіст Руслан Салей падпісаў кантракт з клубам Нацыянальнай хакейнай лігі "Фларыда Пантэрз". Згодна з пагадненнем, беларус за чатыры гады атрымае 12,1 мільёна долараў.

Самым жа багатым спартсменам свету з'яўляецца не прадстаўнік Беларусі, а нямецкі аўтагоншчык Міхаэль Шумахер. Яго заробак у год складае 42,3 мільёна фунтаў. Тэнісістка Марыя Шарапава атрымлівае 13,4 мільёна фунтаў у год. Дарэчы, Марыя мае беларускія карані. У Гомелі жыве яе бабуля.

Грошы на вываз

Якую суму грошай можна вывозіць з Беларусі без дэкларацыі? І наогул, ці ёсць нейкія абмежаванні пры вывазе грошай?

Ірына Мартынава, Мінск.

— У прынцыпе любая сума, якая вывозіцца з тэрыторыі нашай краіны дэкларуецца. Толькі калі ты маеш пры сабе суму, не перавышаючую 3000 долараў, то дастаткова вуснага пацвярджэння. Калі сума перавышае 3000 долараў, яе трэба дэкларава́ць пісьмова.

Адзінае абмежаванне для фізічных асоб — з тэрыторыі нашай краіны нельга вывозіць суму, якая перавышае 10.000 долараў ЗША. Выключэнне можа быць зроблена толькі пры наяўнасці пісьмовага дазволу банка ці мытнага органа.

Калі адкрыюцца новыя станцыі метро?

Калі будуць уведзены ў эксплуатацыю новыя станцыі мінскага метрапалітэна, а канкрэтна ўчастак ад станцыі метро "Усход" у бок Уручча?

Андрэй Ключнікаў, Мінск.

— Плануецца, што гэты ўчастак метро будзе дабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю ў 2007 годзе. Ад станцыі метро "Усход" у бок мікрараёна "Уручча" будуць функцыянаваць дзве станцыі — "Старабарысаўскі тракт" і "Уручча". Працягласць гэтага ўчастка сталічнага метрапалітэна — 2 кіламетры 755 метраў. Дарэчы, 755 метраў будуць пройдзены адкрытым шляхам.

Суседу пагражае штраф

Мой сусед практычна на маёй тэрыторыі паставіў металічную агароджу. Ці можна яго прыцягнуць да адказнасці?

Зміцер Сідарэня, Мінская вобласць.

— Можна, толькі ў тым выпадку, калі ваш сусед самавольна захапіў кавалак вашага ўчастка. Усё можна ўдакладніць па плану. Скаргу можна напісаць у адміністрацыйны орган. Усталяванне агароджы павінна было быць узгоднена з вамі. Калі парушаны правілы добраўпарадкавання, то гэта парушэнне закону. Парушальнік можа быць пакараны штрафам да пяці базавых велічынь.

Куды знік Парфяновіч?

Хацелася б даведацца, чым зараз займаецца былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Парфяновіч? Чаму ён так імкліва сышоў з палітычнай арэны?

Ілля Крымаў, Гродна.

— За каментарыем мы звярнуліся да самога трохразовага алімпійскага чэмпіёна. Нагадаем толькі, што Парфяновіч ніколі не трымаўся за пасады і крэслы. У свой час Уладзімір Уладзіміравіч лёгка развітаўся з членствам у Нацыянальным алімпійскім камітэце і пакінуў пасаду старшыні асацыяцыі веславання: *"Я не сышоў з палітычнай арэны. Проста не бачу сэнсу працаваць з дзеячамі апазіцыі, многія з якіх за апошні час сябе папросту дыскрэдытавалі. Не бачу сэнсу працаваць і з прадстаўнікамі нелегітымнай улады. Грантаў я не атрымліваю. Таму зараз перада мной стаіць больш празаічная задача — пракарміць сям'ю. Кручуся...",* — гаворыць Уладзімір Парфяновіч.

Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34-А, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь".

Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.



ЧУЛІ?

Восень. Электрычкі не ідуць

З 1 верасня скарачаецца колькасць прыгарадных цягнікоў, што ідуць з Мінска, на ўсіх напрамках.

Змяненні ў расклад уносяцца ў сувязі з завяршэннем дачнага сезона і пераходам на зімовы графік руху прыгарадных цягнікоў.

У прыватнасці, электрацягнікі па маршруце Мінск—Аляхновічы адменены: у суботу — у 7.53, 8.31 і 9.51; у нядзелю — у 13.56. На асіповіцкім напрамку адменены цягнікі Мінск—Пухавічы ў суботу ў 7.25 і 8.47, а таксама Мінск—Талька ў суботу ў 11.03, у нядзелю — у 15.55. Адмяняюцца электрычкі па маршруце Мінск—Стоўбцы з часам адпраўлення па выхадных 7.31, 9.54 і 12.09. Па пятніцах, суботах і нядзелях адмяняецца электрацягнік Мінск—Гарадзея ў 14.36. Па нядзелях адменена электрычка Мінск—Коласава ў 19.06. Апрача таго, па выхадных днях адменены электрычкі Мінск—Барысаў з часам адпраўлення 9.57 і 11.36, а таксама Мінск—Смалявічы ў 7.34.

Марына НОСАВА.

У расклад руху міжгародніх аўтобусаў з Мінска ўнесены шэраг змяненняў і дапаўненняў

У расклад руху міжгародніх аўтобусаў з Мінска ўнесены шэраг змяненняў і дапаўненняў, паведамілі БелаПАН на прадпрыемстве "Мінсктранс".

Так, адкрыты рух па маршруце Мінск — Нясвіж, аўтобус адпраўляецца з Мінска ў 11.00 па будных днях і ў 19.00 па нядзелях.

Адменены рэйс Мінск — Светлагорск (17.50) па аўторках, серадах, чацвяргах, суботах. Цяпер ён ажыццяўляецца па пятніцах і нядзелях.

Адкрыты рух аўтобусаў малой уяшчальнасці па экспрэсным прыгарадным маршруце Мінск — Радашковічы праз Ратамку, Заслаўе, Лашаны, Шчарбіны (мемарыял "Лінія Сталіна"). Аўтобус адпраўляецца з Мінска ад аўтавакзала "Цэнтральны" ў 8.30, 11.00, 13.20, 16.20, 19.30.

Па маршруце Мінск — к.п. Нарач (10.30) цяпер з'явіўся новы прыпынак "Сваткі" — на 122-м км ад Мінска, па ўсіх днях тыдня; у 17.00 адменены прыпынак "Ілья".

Са жніўня па ўсіх днях тыдня адкрыты рух аўтобусаў малой уяшчальнасці па маршруце Мінск — Узда праз пас. Энергетыкаў. Рэйсы выконваюцца з Мінска ад аўтавакзала "Цэнтральны" ў 8.20, 8.50, 12.50, 14.20, 16.00, 17.40; ад аўтастанцыі "Паўднёва-Заходняя" адпаведна ў 8.40, 9.10, 13.10, 14.40, 16.20, 18.00 (з Узды — у 6.00, 6.20, 11.20, 12.20, 14.30, 16.00).

Рэйс па маршруце Мінск — Лепель (11.10) выконваецца па ўсіх днях тыдня, апрача нядзелі, але ўведзены па суботах.

На аўтобусах па маршруце Мінск — Гродна для рэйса адпраўленнем з Мінска ў 7.20 (з Гродна ў 15.25) па просьбе пасажыраў ўводзіцца ў абодвух напрамках руху прамежкавы тарыфны пункт "Рум" (па патрабаванні), што размешчаны на 82-м км ад Мінска.

У жніўні па пятніцах рэйс Мінск — Гродна (20.00) выконвацца не будзе.

Марына НОСАВА.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Яшчэ не позна!

Што трэба зрабіць, каб нас было болей...

Шаноўныя чытачы!

Мы прасілі Вас зрабіць **перадаплату** за нумары, якія будуць выдадзены ў верасні—снежні, да канца жніўня. Але ж абставіны, як бачым, уносяць свае карэктывы. Нехта толькі вярнуўся з адпачынку, нехта меў фінансавыя цяжкасці, нехта проста з-за мітусні запамятаў, што трэба забегчы ў філіял банка альбо на пошту — адным словам, пакуль не ўсе паспелі зрабіць **перадаплату.**

Як ні складана, але мы вырашылі: ніводнага прыхільніка свабоднага слова не пакінуць без "Народнай волі". Калі Вы аформіце **перадаплату** ў бліжэйшыя дні, мы зможам, хоць і са спазненнем, але даслаць Вам усе папярэднія нумары. Так будзем дзейнічаць і на працягу астатняга часу.

Нагадваем, можна адразу зрабіць перадаплату за ўсе чатыры месяцы (верасень, кастрычнік, лістапад, снежань). У такім выпадку мы забяспечым Вас усімі нумарамі "Народнай волі" да Новага года. Калі ёсць фінансавыя цяжкасці, **перадаплату** можна зрабіць за месяц, два, тры...

Яшчэ раз звяртаемся да заможных людзей: дапамажыце, даражэнькія, тым, хто не мае магчымасці выдзеліць са свайго сціплага бюджэту пэўныя сродкі, але вельмі хацеў бы чытаць "Народную волю". Ва ўсе вякі лічылася за гонар дапамагчы бяднейшым. Зрабіце добры падарунак сваім родным і блізкім, саслужыўцам і суседзям, тым, хто чакае вашай дапамогі. Вельмі важна, каб мы, прыхільнікі дэмакратыі, былі разам.

Як і раней, пералічвайце сродкі праз філіялы "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, праз паштовыя аддзяленні. Пытанне можна вырашыць таксама ў офісе рэдакцыі. Сума перадаплаты за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз папярэджваем: не паддавайцеся на правакацыі, калі ў некаторых філіялах "Беларусбанка" альбо ў паштовых аддзяленнях Вам будуць па надуманых прычынах адмаўляць у пераводзе грошай. Вы дзейнічаеце ў адпаведнасці з законам (патрабуйце кнігу скаргаў, тэлефануйце ў вышэйстаячыя ўстановы...), і ніхто не мае права Вам перашкаджаць. Аб любым інцыдэнце паведамляйце ў рэдакцыю.

Перасылайце ў рэдакцыю не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за сентябрь,				
октябрь,	ноябрь,	декабрь		
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за сентябрь,				
октябрь,	ноябрь,	декабрь		
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля» за сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2006 года

(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное— подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное— подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ШАШКІ

Мелодыя камбінацыі

Шашачная кампазіцыя падкупляе мелодыяй камбінацыі, асабліва, калі яна, як і музычны твор, упрыгожваецца аўтарам прыемным развітальным акордам. Вось адна з іх, якая якраз завяршаецца рэдкім матывам:

Белыя: b6, c5, c7, d6, f6, g1, g5, h6 (8).

Чорныя: a5, b2, c3, e3, f2 f4, f8, h4 (8).

Выйгрыш.

Таго, хто дашле на яе самы аптымальны адказ, чакае сюрпрыз — кніга на шашачную тэму.

Тэрмін для адказаў — традыцыйныя два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

Супаставім рашэнні

Праверце, калі ласка, рашэнні раней змешчаных пазіцый.

"Ахвяры дзеля апазіцыі", "Ахвяра дамак" і "Уцягненне ў ланцуг". Класіфікацыйны конкурс-20 (У. Матус):

№7. 1. dc5 2. e:g3 3. cb8 4. b:e1 5. e:e7 6. h:b4 7. a:c3x. Паза конкурсам (М. Грушэўскі): 1. gh2 2. e:g3 3. cd8 4. h:f4 5. fe5 6. de7 7. h:e5x. Да мэты вядзе і 1. gf2 2. cd8 3. db6! 4. e:e7 5. h:d2x. Заўважылі У.Сапяжынскі, А.Янчук, Л.Жыхар і А.Чумакоў. Ці выратоўвае становішча дабаўленне простай чорных на h8, меркаванні чытачоў разышліся, як кажуць, у розныя бакі. Аўтар выправіў праблему без h8 пераносам e3 на d2 і g1 на h2: 1. de3 і г.д.;

№8. 1. ab8 2. gf2 3. cd8 4. b:c1 5. cg5! 6. d:e7 7. h:b4 8. a:c3x. Дапускае перастаноўку хадоў, што ў даным выпадку не з'яўляецца прыватным пабочным рашэннем: 2. cd8 і г. д.;

№9. 1. ba3 2. gf2 3. ed2 4. a:c7 5. de3 6. h:d6 7. b:d6 8. a:c5 9. de7 10. h:f2x.

"Версія ідэі" (М.Грушэўскі): 1. cd8 2. h:f4 3. fe5 4. de7 5. h:e5x.



"Пастаўская вясна":

№4 (М.Разаева — А.Андрыянаў). 1 ...ab6! 2. e:g3 ed6 3. cd2 ba5 4. dc3 ba7 5. hg5 de5=.

Звярнулі ўвагу Д.Камчыцкі (Магілёў) і П.Шклудаў (Навапоацк);

№7 (Ф.Маркевіч — А.Плакхін). 5 ... ba5! 6. ef6 de7 7. f:b6 a:c7x. Прааналізаваў Ігар Ананіч (Гродна).

Рашылі: А.Перавознікаў і У.Сапяжынскі (Рагачоў), А.Янчук (Камянец), Марыя Лічко і яе пляменнік У.Дубатоўка (в. Возера Узденскага р-на), В.Дзялендзік (Бабруйск), І.Мацкевіч і М.Клязовіч (Жодзіна), В.Бялоў (Магілёў), А.Свістуноў (Жыткавічы), А.Чумакоў (Светлагорск), А.Ліцьвінаў і В.Касцян (Мінск), П.Каролік і С.Алымаў (Гомель), Л.Жыхар (г.п. Крывічы Мядзельскага р-на), І. Працук (Паставы) і іншыя.

Чэмпіянаты Еўропы і свету

Мы раней паведамлялі, што ў сталіцы Манголіі Улан-Батары гамяльчанін Андрэй Толчыкаў стаў двухразовым чэмпіёнам свету па шашках-100 сярод кадэтаў. Пасля гэтага ў Таліне адбыўся чэмпіянат Еўропы сярод юнакоў і кадэтаў. І тут нашы **Ігар Міхальчанка** з Ваўкавыска (юнакі) і Андрэй Толчыкаў (кадэты) заваявалі залатыя медалі ў сваіх узроставых катэгорыях. Кадэтка **Вольга Федаровіч** (Мінск) атрымала "бронзу".

А ў першынстве свету сярод юніёраў, які ладзіўся ў галандскім горадзе Хайкене, Ігар Міхальчанка і Андрэй Толчыкаў зноў вызначыліся і занялі другое і трэцяе прызавыя месцы адпаведна. Званне ж чэмпіёна прысуджана **Піму Мерсу** (Нідэрланды).

Майстар на ўсе рукі

Наш самы актыўны аўтар гросмайстар **Леанід Вітошкін** з Гомеля, бадай, адзіны складальнік, які паспяхова выступае ва ўсіх жанрах шашачнай кампазіцыі. На наступных прыкладах пераканайцеся ў тым, што ў сваёй справе ён сапраўды з'яўляецца майстрам на ўсе рукі:

1.Белыя: дамкі 17, 49 (2). **Чорныя:** 9, 35. 37 (3).

Эцюд-100: 26 (40A) 48 (45) 40x. A(41) 37x.

2.Белыя: 33, 34, 38, 43, 45, дамкі 2, 39 (7). **Чорныя:** 25, дамка 15 (2).

Задача-100: 32 (16A) 33, 40, 33-24, 30#. A(49) 35 (27) 22, 49, 44 (34B) 45-40, 50#. B(35) 45-40#.

3.Белыя: 20, 24, 29, 30, 35, 37, 44 (7). **Чорныя:** 4, 12, 13, 22, 28, 32, 43 (7).

Мініяцюра-100: 39, 23, 10, 24x.

4.Белыя: 20, 27, 29, 31, 38, 39, 49 (7). **Чорныя:** 7, 8, 9, 15, 17, 36, 40. 41 (8).

Праблема-100: 22, 4, 47 (50) 44x.

5.Белыя: дамкі c5, c7, g1, g5 (4). **Чорныя:** a3, c3, дамка g7 (3).

Эцюд-64: c1 (ab2A) a3 (d2) f4 (c1) f8 (h6) e3x. A(h8) e5 (a7B) ce3x. B(b6) a7 (d2C) h6, d4x. C(cb2) d4x.

6.Белыя: e5, e7, f6, g1, g7, h2, дамкі a1, c7, d6, h6 (10). **Чорныя:** a7, b8, f8, h8 (4).

Задача-64: g3, a5 (c7A) b8, f2, f8, b2, fg7, e5, c3, c1#. A(a7) a5-c3, db4, a5, ab4, e3, gf2, e5, h2#.

7.Белыя: c5, d4, f2, f4, g3, g5 (6). **Чорныя:** a3, c7, d6, e7, g7, h2 (6).

Мініяцюра-64: h6, b8 (c3A) b2, gf4, a7x. A(g1) a7, f4x. Легальнасць пачатковай пазіцыі даказваецца: 1. дамка ab6 cd6 2. hg5 a:c7 і ўзнікла зыходнае становішча.

8.Белыя: b6, c1, d6, e1, e7, f6, g1 (7). **Чорныя:** a3, a7, d4, e3, f4, g3, g5, h2, h4 (9).

Праблема-64. Пашукайце ў ёй пераможную перавагу за белых самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Мікалай ГРУШЭЎСКІ, майстар спорту.

ШАХМАТЫ

Юбілею чемпионки посвящен

В Грузии подведены итоги международного конкурса составления этюдов, который был посвящен 65-летию выдающейся шахматистки, пятикратной чемпионки мира Ноны Гаприндашвили. На конкурс поступило 41 произведение этюдоистов из разных стран. Первый приз жюри присудило россиянину А.Сочневу.

А.Сочнев

Белые: Крс3, Kh7, п. g6 (3).

Черные: Крh4, Cg1, Kc8, пп. b7, e7 (5).

Белые начинают и выигрывают.

1.g7. Белая пешка стремится в ферзи. Чтобы воспрепятствовать этому, черные идут на жертвы. 1...Cd4+ 2.Кр:d4 e5+ 3.Крd5!! Ключевой момент. Смысл хода выяснится лишь через 15 (!) ходов. (Заметим, что естественное 3.Кр:e5? после 3...Ke7 4.Крf6 Kg8+ 5.Крf7 Kh6+ 6.Крg6 Kg8 7.Kf6 Ke7+ 8.Крh7 b5 9.Крh8! b4 10.Kd5 b3! 11.K:e7 b2 12.Kf5+ Крh5! 13.g8Ф b1Ф 14.Фh7+ Крg5! 15.Фh4+ Крg6 16.Фh6+ Крf7! 17.Фg7+ Крe6 18.Фg6+ Крe5! приводило к ничьей) 3...Ke7+ 4.Крe6 Kg8 5.Крf7 Kh6+ 6.Крg6 Kg8 7.Kf6! Ke7+ 8.Крh7 (8.Крf7? Kf5! 9.g8Ф Kh6+ — ничья) 8...b5 9.Крh8! b4 10.Kd5! b3 11.K:e7 b2 12.Kf5+! (Важный промежуточный ход, если сразу 12.g8Ф?, то 12...b1Ф с ничьей) 12...Крh5! 13.g8Ф b1Ф 14.Фh7+! Крg5. Иначе вскрытый шах конем с выигрышем ферзя. 15.Фh4+ Крg6 16.Фh6+ Крf7 17.Фg7+ Крe6 18.Фg6+! Крd7. Теперь, через 15 ходов проясняется смысл хода 3.Крd5! своя же пешка отнимает у черного короля спасительное поле e5 19.Фh7+! Черный король вынужден отступить на последнюю горизонталь. 19...Крd8 20.Фe7+ Крc8 21.Kd6+ Крb8 22.Фe8+!! Крa7 23.Kb5+ Крb6 24.Фd8+ Крc5 25.Фd6+ Крc5 26.Ka3 или 24...Крb7 25.Фc7+ Крa6 26.Фa7+ Кр:b5 27.Фb7+, и черные теряют ферзя.

Сверьте решение

Трехходовка Н.Нарутя ("Народная воля" за 15.08.): **1.Ch7!** c5 2.Лg6! Крb1 3.Лg1x.

Композиция на "индийскую тему".

В.Крамник набирает форму

Как известно, по решению Международной шахматной федерации (ФИДЕ) 23 сентября в Элисте (Калмыкия) начнется матч за шахматную корону между чемпионом мира Веселином Топаловым (Болгария) и российским гроссмейстером Владимиром Крамником. В.Топалов является официальным чемпионом мира по шахматам. Что касается Крамника, то в 2000 году он победил в матче за чемпионский титул Гарри Каспарова. Правда, их матч проходил вне рамок ФИДЕ, но тем не менее шахматист, победивший чемпиона мира, по традиции считается обладателем шахматной короны. Матч в Элисте должен, по замыслу ФИДЕ, положить конец двоевластию на шахматном олимпе. Поединок между Топаловым и Крамником будет проводиться из 12 классических партий. В случае ничейного счета борьба будет продолжена в быстрых шахматах, а если понадобится, и в блице. Призовой фонд матча — один миллион долларов. Причем он будет поделен поровну между обоими соперниками, независимо от исхода поединка.

Перед матчем оба соперника ведут подготовку к решающему сражению. Последние 2—3 года Крамник не показывал высоких результатов, его рейтинг понизился. А сам он переместился в рейтинг-листе с третьего на седьмое место. Однако в этом году россиянин явно прибавил. На Всемирной шахматной Олимпиаде он блестяще выступил на первой доске в команде России. А в недавно завершившемся супертурнире в Дортмунде (ФРГ) сумел завоевать первый приз, набрав в 7 встречах 4,5 очка. Турнир Крамник провел без единого поражения. Такой же результат показал четырехкратный чемпион России Петр Свидлер, но он уступил победителю по коэффициенту. По 4 очка набрали бывший наш земляк Борис Гельфанд (Израиль), Петер Леко (Венгрия) и Майкл Адамс (Англия), разделившие 3—5-е места. Шестым финишировал Аркадий Найдич (ФРГ) — 3,5 очка. Неожиданным стал провал обладателя Кубка мира Левона Ароняна (Армения), имеющего третий в мире рейтинг. Он набрал всего 2 очка, не выиграв ни одной партии, и занял 7-е место. А замкнул турнирную таблицу победитель Московского международного турнира "Аэрофлот-2006" Баадур Джобава (Грузия) — 1,5 очка. Приводим одну из партий победителя турнира.

Б.Джобава — В.Крамник

Новоиндийская защита

1.d4 Kf6 2.c4 e6 3.Kf3 b6 4.Kc3 Cb7 5.a3 d5 6.cd K:d5 7.Cd2 Kf6 8.Фc2 c5 9.dc C:c5 10.b4 Ce7 11.e4 Kc6 12.Cf4 o-o 13.Лd1 Фc8 14.e5? Выглядит естественным, но белые просматривают возможность тактического удара. Надо было заканчивать развитие посредством 14.Cd3, подготавливая рокировку. 14...K:b4! 15.ab Ke4! Здесь белые, не найдя удовлетворительной защиты, признали свое поражение.

Памяти Р.Холмова

В Москве прошел турнир ветеранов памяти известного гроссмейстера Ратмира Холмова. Участники сражались в быстрые шахматы. Победителем стал международный гроссмейстер Евгений Васюков, набравший 8 очков из 10 возможных. На очко меньше в активе гроссмейстера Игоря Зайцева, завоевавшего второй приз.

ПАСЛУГІ

Прыём макулатуры, шклатары з хаты ў Мінску.

Тэл.: 8-0259-611-187.

Чытайце нас ў інтэрнэце nv-online.info

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 31.08.2006 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №